Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Неазнарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 6 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапарэлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок шапарэлі наперад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпісныя ка 50 проц. дарожэй. Зваш тарыф бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 60 (2549) Субота, 16-га сакавіка 1929 г.

Я. М. Сьвярдлоў—1-шы старшыня Усесаюзнага ЦВК

Я. М. Сьвярдлоў—буйнейшы арганізатар.

Тав. Сталін аб Я. М. Сьвярдлове.

«Ёсьць людзі, правадыры пралетарыяту, аб якіх ня шумяць у прэсе, быць можа таму, што самі яны ня любяць шумець аб сабе, але якія зьяўляюцца тым ня менш, жыцьцёвымі сокамі і сапраўднымі кіраўнікамі рэвалюцыйнага руху. Да ліку такіх правадыроў належаў Я. М. Сьвярдлоў.

Арганізатар да мазга касьцей, арганізатар па натуры, па навыках, па рэвалюцыйнаму выхаваньню чулы арганізатар усёй сваёй кіпучай дзейнасьцю—вось фігура Я. М. Сьвярдлова.

Ідэалёгі і агенты буржуазіі любяць паўтараць бітыя сказы аб тым, што бальшавікі ня ўмеюць будаваць, што яны здольны нібы толькі руйнаваць. Я. М. Сьвярдлоў, уся яго праца зьяўляецца жывым адхіленьнем гэтых плётак. Я. М. Сьвярдлоў і яго праца ў нашай партыі ня ёсьць выпадковасьць. Партыя, якая нарадзіла такога вялікага будаўніка, як Я. М. Сьвярдлоў, можа сьмела сказаць, што яна ўмее таксама будаваць новае, як руйнаваць старое».

Рэвалюцыйная дзейнасьць Сьвярдлова.

(ВОДЛУГ МАТАР'ЯЛАЎ ДЭПАРТАМАНТУ ПАЛІЦЫІ).

«Праз нелегальныя гурткі, праз рэвалюцыйную падпольную працу, праз нелегальную партыю Сьвярдлоў прышоў да пасады першага чалавека першае сацыялістычнае рэспублікі, да пасады першага з арганізатараў шырокіх пралетарскіх мас»,—так сказаў Ленін на пасяджэньні Ўсесаюзнага ЦВК 18 сакавіка 1919 г. у прамове, прысьвечанай памяці Я. М. Сьвярдлова.

Шлях Я. М Сьвярдлова «ад нелегальнага гуртка» можна даволі яскрава прасачыць па дакумантах дэпартаменту паліцыі. Імя „подпольнага мешчаніна" Я. М. Сьвярдлова пачынае сустракацца ў гэтых дакумантах ужо ў 1902 г., калі Сьвярдлову было ўсяго 17 год.

Так, у даносе ніжнягародзкага губернатара ад 25 красавіка 1902 г. сярод „злыбедных падозроных асоб", якія ўдзельнічалі ў непарадках з прычыны раптоўнае сьмерці падпаляднага студэнта Рурыкава, фігуруе подпольны мешчанін Я. Сьвярдлоў". Для пачатку Сьвярдлоў адсядзеў у кутузцы два тыдні.

З гэтага моманту, г. зн. з лета 1902 г. пачынаецца непаслабны нагляд паліцыі за «неспакойным» Сьвярдловым.

У 1903 г. Сьвярдлоў арыштоўваецца і прыцягваецца да адказнасьці па справе «прыналежнасьці да арганізаванага ў Н.-Ноўгарадзе злачыннага супольніцтва, а таксама ў захаваньні і распаўсюджваньні супроцьўрадавых твораў». Па гэтай справе Сьвярдлоў падпаў гласнаму нагляду паліцыі на два гады, пачынаючы з 11 лютага 1904 г. Але хутка ён выяжджае з Ніжняга і пераходзіць на нелегальнае становішча партыйна-прафесыянала.

Сьвярдлоў па даручэньні Паўночнага камітэту прыяжджае для працы ў Кастраму.

У архіве дэпартаменту паліцыі захаваўся перахоплены жандарамі ліст да аднаго таварыша заграніцу. Сьвярдлоў піша: «Я пасяліўся тут у якасьці прафесыянала па даручэньні Паўночнага Камітэту, у склад якога ўваходзіць Кастрама. Справы тут вельмі шмат, а народу амаль што няма. Апрача мяне—усяго 3-4 чалавека, з якіх толькі адзін можа ісьці ў разьлік... Наогул адчуваю сябе даволі бадзёра. Шпікаў тут даволі шмат, але розумам яны не адрозьніваюцца, як я ўжо пасьпеў прыкмеціць. Прышлі мне апошнія лісткі ЦК і ЦА (цэнтральны орган)».

Аднак, у пачатку 1905 г. Сьвярдлову прышлося выехаць з Паўночнага райёну. Дэпартамант паліцыі сочыць за Сьвярдловым па пятах. 17 сакавіка 1905 г. дэпартамант паведамляе начальніку Казанскае жандарскае ўправы, што Сьвярдлоў выехаў з Кастрамы і прапануе яго «ўзяць пад непаслабны нагляд».

Пасьля паражэньня паўстаньня 1905 г. Сьвярдлоў робіць вялікую працу па арганізацыі і ўмацаваньню ўраду, як апоры бальшавізму. З дакумантаў паліцыі відаць, што ў верасьні 1907 г. Сьвярдлоў за прыналежнасьць да Пермскага камітэту РСДРП прысуджан казанскай судовай палатай да двох гадоў крэпасьці.

У верасьні 1908 г. Сьвярдлоў канчае сваю адсідку ў крэпасьці, а 13-га сьнежня таго-ж году ён зноў быў арыштаваны ўжо ў Маскве па пасядзеньні МК РСДРП. Па гэтай справе Сьвярдлоў высылаецца ў адміністрацыйным парадку на тры гады ў Нарымскі край.

У чэрвені 1910 г. паўтомны Сьвярдлоў, ня гледзячы на хваробу і адлегласьць учыніў свой першы набег і з гэтага часу пачынаецца паласа набегаў.

У лістападзе 1910 г. Сьвярдлоў быў арыштован у Пецярбурзе, апазнаны і назад накіроўваны ў Сібір пад гласны нагляд паліцыі ўжо не на тры, а на чатыры гады. Па дакумантах паліцыі Сьвярдлоў 18-га красавіка 1912 г. удзельнічае ў дэманстрацыі адміністрацыйна-высыльных у Нарыме, за што арыштоўваецца і накіроўваецца пад вартаю двох стражнікаў у Асьцюцкае селішча «Максимкин яр». Месца было да таго дрэннае, што самі стражнікі ня вытрымалі і вярнуліся разам са Сьвярдловым у Нарым. Пасьля гэтага Сьвярдлоў зноў уцякае ў Пецярбург.

У пачатку 1913 г. Сьвярдлоў зноў арыштоўваецца. Але цяпер паліцыя высылае яго так далёка (у Туруханскі край), што ўсе спробы да набегу, а іх было ня мала, не даюць ніякіх вынікаў. У перахопленым жандарамі лісьце Сьвярдлова на імя сястры ад 9-га лютага 1913 г. Сьвярдлоў піша: «Мяне і Язэпа Джугашвілі (Сталін) пераводзяць на 100 вёрст на поўнач, на 80 вёрст на поўнач ад палярнага круга. Толькі ў двах будзем у высыльцы і пры нас два стражнікі. Нагляд узмацнілі, ад пошты адарвалі. Апошняя—раз у месяц, праз хадака, які часта позьніцца.

Сьвярдлоў усё-ж трымае сувязь з заграніцаю і робіць роспачныя спробы да новых набегаў, але ўсё наўдала. Толькі пасьля лютаўскае рэвалюцыі ён паяўляецца ў Піцеры, дзе ў красавіку пасьля прыезду Леніна, робіцца адным з яго галоўных памоцнікаў, а пасьля Кастрычніка займае пасаду 1-га старшыні Усесаюзнага ЦВК

Гадавіна сьмерці Сьвярдлова ў Маскве.

У Камуністычным універсытэце імя Я. М. Сьвярдлова дзень сьмерці (16-га сакавіка) абвяшчаецца днём жалобы. У ўнівэрсытэце адбудзецца жалобнае пасяджэньне, на якім супольнікі Сьвярдлова выступяць з успамінамі аб яго жыцьці і дзейнасьці.

На жалобнае пасяджэньне запрошаны брат, удава і дзеці Сьвярдлова, рабочыя тэкстыльнае фабрыкі імя Сьвярдлова і прадстаўнікі камуза Сьвярдлова (нядзельны універсытэт, вечэрні універсытэт, школа імя Сьвярдлова і інш.).

Гістарычнаму габінету ўнівэрсытэту Сьвярдлова даручана арганізаваць выстаўку, якая павінна адбіць асноўныя этапы жыцьця і дзейнасьці Сьвярдлова. У ўнівэрсытэце выдаецца спэцыяльны нумар друкаванае газэты «Свердловия».

Апрача таго, у адзін з гэтых дзён між 16 і 18 сакавіка прадугледжваецца агульна-маскоўскае жалобнае пасяджэньне, прысьвечанае памяці Сьвярдлова.

Працэс Грамады.

Паказаньні Гурына і Бабіча поўнасьцю фальшывыя.

Пасьля скончэньня спрэчак бакоў у парадку рэплікі ўзяў слова пракурор Парчэўскі, які падтрымліваў тэзісы абвінавачаньня. У сваёй прамове пракурор галоўным чынам стараўся абяліць сьведкаў абвінавачаньня—Гурына, Бабіча і Кузьму. Па заяве пракурора «да паказаньняў гэтых сьведак трэба падыходзіць з вялікаю асьцярожнасьцю, але ўсё-ж немагчыма іх адхіліць". Пасьля пракурора выступілі абаронцы.

Абаронца Пятрусэвіч падкрэсьлівае, што па статуту нельга судзіць абвінавачаных на падставе паказаньняў вядома няпэўных сьведак і аналізуючы паказаньні Гурына і Бабіча, зазначае, што яны зупоўна фальшывыя.

Абаронцы Бабянскі, Этынгер і Смуроўскі абвяргаюць усе довады пракурора і патрабуюць апраўдальнага прыгавору. Судовае сьледзтва абвешчана скончаным.

Абарона ўнесла прапанову аб выключэньні з пунктаў абвінавачаньня 102 арт., які ня можа быць прыстасаваны ў даным выпадку.

Суд адхіліў гэту прапанову абароны і пакінуў пункты абвінавачаньня ў тым выглядзе, як яны фігуравалі ў акруговым судзе, пасьля чаго вышаў на нараду для вынясеньня прысуду.

Прысуд чакаецца ў суботу а 9 гадзіне ўвечары.

Бэрлінскі суд бароніць „гонар" Носке.

Носке—сапраўды прахвост і агідзік.

БЭРЛІН, 14-III. Сёньня ў Берлінскім судзе распачаўся разгляд справы, распачатае натхненцем белага тэрору часоў нямецкае рэвалюцыі сацыял-дэмакратам Носке, супроць пісьменьніка Эрнста Фрыдрыха па абвінавачаньні ў зьнішчэньні словам. Прычынаю да пачатку гэтае справы быў артыкул Фрыдрыха, у якой ён у свой час назваў Носке прахвостам і агідзікам.

На працэсе Фрыдрых заявіў, што ён назваў Носке зусім правільна. Водлуг слоў Фрыдрыха яго правасьць даказваецца ня толькі тымі мерзкаваньнямі аб Носке, якога называюць у рабочых колах „забойцаю рабочых", якія прадказваюцца пачуцьцямі. Фрыдрых гатоў нават даказаць шляхам апыту спэцыялістаў і знаўцаў гісторыі нямецкае рэвалюцыі, што напісаныя ім на адрасе Носке словы зьяўляюцца зусім справядлівымі.

Сам Носке, атрымаўшы позву на суд, на працэсе ня прысутнічае, бо падарожнічае ў сучасны момант на Ні жземнаму мору.

Швэйцарскі ўрад—у абарону фашыстаў.

БЭРЛІН, 14-3. Водлуг паведамленьняў з Берну, агульнашвэйцарскі ўрад забараніў назначаны на 24 сакавіка ў Базэлі «Чырвоны Збор», які павінен быў адбыцца замест забароненай анты-фашысцкай маніфэстацыі, якая прадугледжваецца ў Тэсіне. Збор забаронен, ня гледзячы на тое, што кантрольны ўрад Базэльскага кантону з свайго боку не знайшоў ніякіх законных падстаў для гэтае забароны. Ня гледзячы на забарону, базэльскія рабочыя маюць намер, аднак, арганізаваць „Чырвоны збор".

Румынія ратыфікавала пакт Келёга.

МАСКВА. Учора польскі пасланьнік у Маскве пан Патэк паведаміў нотаю часова выконваючага абавязкі Наркома па замежных справах Літвінава, што румынскі ўрад ратыфікаваў 7-га лютага г. г. парыскі ўгавор ад 27-га жніўня 1928 г. аб адмаўленьні ад вайны ў якасьці зброі нацыянальнае палітыкі.

У Саюзных Рэспубліках.

Скончыўся зьезд прэзыдыумаў Дзяржплянаў.

МАСКВА. Усесаюзны зьезд прэзыдыумаў Дзяржплянаў скончыў сваю працу. Зьезд заслухаў 15 дакладаў па пяцігадоваму пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі СССР. У спрэчках бралі ўдзел звыш 10 прадстаўнікоў наркаматаў, прафсаюзаў, рэспублік і раёнаў. Зьезд аднагалосна ўхваліў зварот ЦК УсеКП(б) і ВСНГ СССР у якім гаворыцца: „Пяцігадовы плян цалкам пабудаваны на дырэктывах 15-га зьезду партыі і наступных пленумаў ЦК. На падставе рашучага перамаганьня «вузкіх месц» у разьвіцьці народнае гаспадаркі на базе шпаркага тэмпу разгортваньня індустрыялізацыі краіны ў рашаючых галінах народнае гаспадаркі, пяцігадовы плян адчыняе новыя шляхі рэканструкцыі ўсёй эканомікі краіны і стварае моцныя прыводныя рамяні ад гораду да вёскі ў інтарэсах сапраўднае сацыялістычнае перабудовы шматмільённае масы дробных і вусім маленькіх індывідуальных сялянскіх гаспадарак".

50 проц. усяго насеньня будзе ачышчана.

МАСКВА, 14-III. Адбылося пасяджэньне сталае нарады пры „Упаўнаважаным ураду РСФСР па правядзеньні вясеньняй пасеўнай кампаніі, на якім былі заслуханы даклады аб ходзе вернаачышчальнае кампаніі на мясцох. Поўных вестак аб колькасьці ачышчанага зярна яшчэ няма, бо кампанія на мясцох толькі разгортваецца. Водлуг няпоўных вестак на 1 сакавіка ачышчана каля 5 міліёнаў цэнтнэраў насеньня, ці прыкладна 30 процантаў пляну. Даклады з месц гаворацьць, што сёлета зернаачышчальная кампанія, ня прыклад мінулым гадам, разгортваецца куды шырэй і ня гледзячы на спазьненьне і шэраг асобных недахопаў ёсьць падставы заварацьць, што заданьне ўраду аб перадвясеньняй ачыстцы ня менш 50 проц. усяго засеваемага яравога зярна па найбольш галоўных вытвараючых раёнах будзе выканана.

Растлумачэньне УсеЦСПС аб прафсаюзным сяброўстве пазбаўленых выбарчых правоў.

МАСКВА. У адказ на запытаньні мясцовых арганізацый УсеЦСПС растлумачыў, што асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў, захоўваюць прафсаюзнае сяброўства ў працягу аднаго году з моманту пазбаўленьня іх выбарчых правоў, калі яны ўзбудзілі хадайніцтва аб аднаўленьні ў выбарчых правах. У гэтым выпадку зьяцьце гэтых асоб з працы па матывах пазбаўленьня выбарчых правоў не дапушчаецца. Захоўваючы прафсаюзнае сяброўства пазбаўленыя правоў, аднак, ня могуць быць абранымі ў органы прафсаюзаў. У выпадку вырашэньня пытаньня аб пазбаўленьні выбарчых правоў у апошняй інстанцыі (ЦВК Саюзных рэспублік) да скончэньня гадовага тэрміну — пазбаўленыя правоў павінны зараз-жа выключацца з прафсаюзаў.

Стан пасеваў.

МАСКВА, 14-III. Водлуг даных Наркамзему РСФСР, за першыя дзесяць дзён сакавіка ў стане пасеваў значных зьмен не адбылося. Палі пакрытыя дастатковым пластом сьнегу і марозы не адбіліся на стане азімінаў. Вопытныя станцыі паказалі спробы, што азімінаў жыва і процант загінуўшага насеньня не перавышае нормы.

Ангельскія рабочыя абураны выступленьнем Троцкага.

КІЁЎ, 14-3. Сёньня ў Кіеў прыехалі два ангельскія рабочыя - мэталёўцы, запрошаныя на працу на адным з мэталюргічных заводаў СССР. У гутарцы в супрацоўнікам Ратау, адзін з прыехаўшых член ангельскага рабочага саюзу Рэйнфорд заявіў адносна апошніх выступленьняў Троцкага ў ангельскім буржуазным друку наступнае: «Вельмі характэрна, што людзі, якіх я асабіста ведаю, як лютых ворагаў бальшавізму, зараз усяк выхваляюць Троцкага. Сярод перадавой часткі ангельскіх рабочых выступленьне Троцкага выклікала шчырае абурэньне. Мы будзем энэргічна змагацца в тым паклёпам, які распаўсюджвае зараз Троцкі аб СССР».

Выраб дэталяў да трактараў Фордзона.

ЛЕНІНГРАД, 14-3. Вытворчы саюз распачаў загатоўку запасных частак да трактараў Фордзона. Пакуль што выпрацоўваецца 16 розных дэталяў. Здача запасных частак пачнецца ў маі. У далейшым вытворчы саюз будзе выпрацоўваць яшчэ 30 дэталяў.

Замест нядзелі—дзень адпачынку серада.

ТОМСК, 15-3. На пачыну школы імя Кастрычнікавае рэвалюцыі, усе школы гораду перанесьлі дзень адпачынку з нядзелі на серыду. Мэта гэткага пераходу—парваць з старою традыцыяю і адзначыць серыду, як дзень пачатку Кастрычнікавае рэвалюцыі. Школьнікі выклікалі ўзяць з іх прыклад рабочых. На некаторых прадпрыёмствах прыняты аналёгічныя пастановы.

Асаднае становішча ў Паўднёвай Бэсарабіі.

Пагроза паўстаньня на глебе голаду.

ВЕНА, 14-3. Бэсарабскія газэты паведамляюць, што румынская ўлада распаўсюдзіла асаднае становішча на Паўднёвую Бэсарабію да Эскіпэлоса і Кейрачэка, г. зн. аднавілі яго ў Паўднёвай Бэсарабіі ў ранейшых разьмерах. Вайсковыя колы Румыніі абгрунтоўваюць гэта мерапрыёмства створанай небясьпекай новага паўстаньня на глебе ўзрастаючага голаду. Як паведамляе „Вістарул", у выніку назначанага ўрадам расьледаваньня, зачынен Кішынёўскі рабоча-сялянскі орган „Правда". Апошнія дні ў Бэсарабіі арыштавана некалькі сот чалавек. „Адэвэрул" выказвае здавальненьне з прычыны лютых мэтадаў барацьбы в камуністычным рухам, якія ўжыў урад і патрабуе яшчэ больш лютых мер, каб канчаткова „расправіцца" з камуністычнымі агітатарамі.

ГОЛАД У БЭСАРАБІІ.

ВЕНА, 6-3. Водлуг паведамленьняў „Бэсарабскага Слова" румынскі ўрад даў да гэтага часу для галадуючай Бэсарабіі толькі нічтожную суму ў 20000 міліёнаў лей. (Лея 1 кап.). З гэтае сумы на душу галадуючага насельніцтва прападае 8 кап. Ня гледзячы на голад у леташнім годзе ў Бэсарабіі спагнана 2 міліярды лей падатку. Для аказаньня самае неадкладнае дапамогі неабходна 750 міліёнаў рублёў. З іх 600 міліёнаў для вёскі і 150 міліёнаў для гораду. Міністр працы паведамляе, што на дапамогу галадуючым да гэтага часу накіравана ўсяго 7000 вагонаў хлеба, з іх раздадзена пакуль толькі 3600 вагонаў.

Новы закон аб абароне дзяржавы.

ВЕНА, 6 3. 1 сакавіка агалошан дэкрэт, які дапаўняе закон аб абароне дзяржавы. Водлуг новага закону ўзмацняюцца пакараньні за злачынствы супроць дзяржавы. Забараняецца, пад пагрозаю пяцігадовага зьняволеньня ў астрозе, прапаганда за аддзяленьне якіх-небудзь вобласьцяў ад Румыніі, за вымену дзяржаўнага, палітычнага і грамадзкага ладу.

У АПОШНІ ЧАС.

ПОЛЬСКІ СОЙМ РАТЫФІКАВАЎ МАСКОЎСКІ МІРНЫ ПРАТАКОЛ.

(АТРЫМАНА А 1-ай ГАДЗІНЕ НОЧЫ).

ВАРШАВА, 15. 13-га сакавіка сойм ратыфікаваў маскоўскі пратакол. Дакладчык, між іншым, заявіў: «З прычыны таго, што СССР ня член Лігі, пратакол мае асаблівае значэньне дзеля захаваньня міру ва Усходняй Эўропе. Надта важна, што Румынія, па ініцыятыве Польшчы, далучылася да пратаколу і такім чынам канстатавала становішча міру між СССР і Румыніяй».

Выступіўшы ў спрэчках пэпэсавец Чапінскі заявіў, што маскоўскі пратакол—крок да заснаваньня мірных адносін між Польшчай і СССР.

Дэпутат украінскага клюбу Васыньчук выказаўся супроць ратыфікацыі пратаколу. «Пратакол,—заявіў ён,—выходзе з фактычнага становішча рэчаў, якое выяўляе сабой ня што іншае, як падзел украінскіх зямель між Расеяй, Польшчай і Румыніяй. Я заяўляю, што ніякія выступленьні і акты захватчыкаў украінскіх зямель не абавязваюць украінцаў».

Эндэк Стронскі заявіў, што ратыфікацыя пратаколу павінна стаць апошнім этапам на шляху заключэньня гарантыйнага пакту, ад заключэньня якога Савецкі ўрад не адмаўляецца, як ён заявіў у сваёй першай ноце аб пратаколе. Нарэшце Стронскі выказаў жаль, што перагаворы адносна польска-савецкага пакту аб ненападзе стаяць на працягу трох год на мёртвым пункце.

Прадстаўнік блёку супрацоўніцтва з ўрадам Леўнгерц заявіў, што маскоўскі пратакол дапамагае замірэньню і стабілізацыі ўсходняй і сярэдняй Эўропы.

Беспартыйны блёк, заявіў прамоўца, лічыць, што няма такой мэты, імкненьне да якой не апраўдвала-б наступацельную вайну.

З вялікай прамовай выступіў прадстаўнік ад беларускага рабоча-сялянскага клюбу Гаўрылюк, які намаляваў жудасны малюнак палітычнага і эканамічнага становішча Заходняй Беларусі.

« Савецкі ўрад, — заявіў Гаўрылюк, — выступіў з шчырымі мірнымі прапановамі, бо яны падтрыманы патрабаваньнем усеагульнага разброеньня. Толькі СССР далучыўся да пакту Келёга з думкай аб запраўдным захаваньні міру».

Нарэшчэ Гаўрылюк агаласіў наступную дэкларацыю: «Разглядаючы падпісаньне пакту Келёга, як этап на мяжу да ўсеагульнага разброеньня, беларускі рабоча-сялянскі клюб, які стаіць на варце працоўных мас Заходняй Беларусі, дзеля выкрыцьця гульні фашысцкага польскага ўраду і дзеля таго, каб не дапамагаць распаўсюджаньню ілюзіі, быццам мір можа быць гарантаваны ўрачыстымі дэкларацыямі, а не барацьбой мас—будзе галасаваць супроць ратыфікацыі пратаколу».

Прадстаўнік ад беларускага клюбу заявіў, што, не жадаючы процідзейнічаць якім-бы то ні было пацыфісцкім прапанаваньням, клюб устрымаецца ад галасаваньня.

Такім чынам, маскоўскі пратакол ратыфікаваны галасамі ўсіх партый супроць камуністаў, славянскіх нацменшасьцяў і беларусаў, якія ўстрымаліся.

АРМІЯ ПОЛЬШЧЫ Ў АДЭНЦЫ ГЕНЭРАЛА ЛЕРОНА.

МЭТА ПАДАРОЖЖА ЛЕРОНА—ПАДРЫХОЎКА ПОЛЬСКАЙ АРМІІ ДА НАПАДУ НА СССР

БЭРЛІН, 14-3. У „Ротэ Фанэ" агалошан сакрэтны даклад францускага генэрала Лерона, які езьдзіў летась з сакрэтнымі даручэньнямі ў прыбалтыцкія краіны, Польшчу, дзяржавы сярэдняе Эўропы і на Балканы. Лерон востра крытыкуе баяздольнасьць польскае армії, прычым яго крытыка прасякнута імкненьнем дамагчыся максымальнай прыгоднасьці польскае армії для наступу супроць СССР. У сваім дакладзе Лерон заяўляе, што пры сучаснай структуры польскае армії яна ня здольна вытрымаць барацьбу супроць войска, якое ўладае моцаю Чырвонае армії, ці нямецкага рэйхсвэра», ня гледзячы на тое, што яна значна перавышае нямецкі рэйхсвэр колькасьцю, кожная наступальная апэрацыя, якую-б польская армія распачала на савецкай тэрыторыі» можа кончыцца катастрофай. Далей Лерон гаворыць, што чырвонаармейскія часьці, разьмеркаваныя на савецка-польскай граніцы дастаткова для таго, каб прыпыніць наступ польскай армії. Даклад хваліць лётны склад польскае авіацыі, але дае крытычныя водзывы аб матар'яльнай частцы, паколькі гутарка ідзе аб матар'ялах польскае вытворчасьці: Лерон выказваецца за замену гэтых матар'ялаў чужаземнымі. Закраналючы пытаньне аб камандным складзе ў польскай армії, Лерон падкрэсьлівае, неабходнасьць «увесьці ў яго зьверху да нізу высокакваліфікаваных францускіх камандзіраў". Вельмі характэрна, што Лерон у сваім дакладзе выказвае непаной з прычыны паводзін сялянства ў тым райёне, дзе адбываліся польскія манэўры леташняга году; як адзначае даклад, усё насельніцтва гэтага райёну пахавалася, так сама як былі схаваны коні і жывёла і ні аб яной дапамозе з боку насельніцтва ня было і гутаркі, дапамогу аказвалі толькі мясцовыя чыноўнікі.

АДКРЫТЫ РАЗГУЛ ФАШЫЗМУ У ПОЛЬСКІМ СОЙМЕ.

ППС і „Вызваленьне" тайна дапамагалі выдачы суду рабоча-сялянскіх дэпутатаў.

Дэманстрацыя камуністаў і беларуска-украінскіх дэпутатаў.

ВАРШАВА, 14-3. Учора сойм большасьцю 135 галасоў супроць 121 пастанавіў пазбавіць дэпутацкае недатычнасьці камдэпутатаў Варскага і Біттэра і дэпутата аб'яднанага сельробу Вальніцкага. Належыць адзначыць, што соймавая камісія адмовілася ў свой час пазбавіць дэпутатаў недатычнасьці, прызнаўшы прад'яўленае ім абвінавачаньне ня сур'ёзным, бо ім інкрымінуецца дэманстрацыя ў гонар дэпутатаў беларускае Грамады пры разглядзе іх справы ў 1-й інстанцыі. Супроць прапановы аб выдачы суду Варскага, Біттэра і Вальніцкага выступаў дэпутат Сыпула. «Фашысцкі ўрад—заявіў ён, распраўляецца з прадстаўнікамі рабоча-сялянскіх мас, выдаючы суду асобных дэпутатаў. Так былі выданы Ланцуцкі, Сахацкі, Бачынскі і шмат інш. прадстаўнікі рабочых і сялян. Патрабуючы выдачы Біттэра, фашысцкі ўрад хоча адпомсьціць за рэвалюцыйнае выступленьне лёдзінскіх рабочых прадстаўніком якіх зьяўляецца Біттэр. Апрача Біттэра сойм зьбіраецца выдаць суду Варскага—старэйшага рэвалюцыйнага дзеяча, які стаіць на чале рабочага руху Польшчы ў працягу 40 гадоў, чалавека, які працаваў поруч з такімі рэвалюцыянэрамі як Роза Люксэмбург, Карл Лібкнэхт, Тішко і Дзяржынскі, якія аддалі сваё жыцьцё рабочай клясе. Расправа в камдэпутатамі не затрымае росту актыўнасьці рэвалюцыйных мас у Польшчы». Вельмі паказальны быў ход галасаваньня. Пастанова аб выдачы была ўхвалена нічтожнай большасьцю ў 14 галасоў. Гэта большасьць атрымалася з прычыны адсутнасьці дэпутатаў „Вызваленьня" і значнае часткі дэпутатаў ППС. Сыпула адзначыў гэта ў сваёй прамове, заявіўшы: «Калі выдаюць суду камдэпутатаў, пэпэсаўцы, якія называюць сябе абаронцамі-дэмакратамі, у перавагу адсутнічаюць і туляцца ў буфэце». Пасьля агалашэньня вынікаў галасаваньня, камдэпутат і частка рэвалюцыйных беларускіх і украінскіх дэпутатаў наладзілі бурную дэманстрацыю. Чуліся выгукі: «Рабочыя прыпомняць вам сёньнешні дзень», «вы хочаце адпомсьціць за лёдзінскую забастоўку», «Проч фашысцкі ўрад і інш.». На тым-жа пасяджэньні галасавалі пытаньне аб выдачы суду дэпутатаў «Вызваленьня». Лаўкі ППС і „Вызваленьня" напоўніліся і адразу змайшлася большасьць, каб адхіліць прапанову аб выдачы.

ІМПЭРЫЯЛІСТЫ „РАЗБРОЙВАЮЦЦА".

АНГЛІЯ «ЎЖО ДАСТАТКОВА ЗРАБІЛА ДЛЯ РАЗБРОЕНЬНЯ»

ЛЁНДАН, 14-3. Агэнцтва Рэйтэр паведамляе: „Уносячы ў палату вобшчын праект бюджэту марскога ведамства, марскі міністр Брыджмэн заявіў, што ў будучым бюджэтным годзе мяркуецца пабудова трох новых крэйсароў, з якіх два належаць да тыпу малых—а 6-ці цалёвымі гарматамі і павінны замяніць некаторыя старыя малыя крэйсары, якія ўжо нягодны. У часе спрэчак па марскому бюджэту палата вобшчын большасьцю 145 галасоў супроць 59 адхіліла рэвалюцыю, унесеную дэпутатам рабочае партыі Мозлі ў якой гаварылася, што, жадаючы выказаць сваю волю за вечны мір ажыцьцёвіць яе на справе, палата вобшчын заклікае ўрад ужыць больш выразную палітыку з мэтаю дамагчыся міжнароднае згоды аб агульным скарачэньні марскіх узброеньняў. Адказваючы на гэту рэзалюцыю ад імя ўраду, Брыджмэн заявіў, што рэзалюцыя сама па сабе ня выклікае пярэчаньняў, але што яна зьяўляецца зусім непатрэбнай, бо ўрад зрабіў ужо ўсё магчымае для таго, каб дамагчыся міжнароднае згоды аб агульным скарачэньні марскіх узброеньняў.

ФРАНЦЫЯ ТАКСАМА „РАЗБРОЙВАЕЦЦА"

ПАРЫЖ, 14-3. Агэнцтва Гавас паведамляе: «Большасьцю 272 галасоў проці 28 сэнат пастанавіў распачаць ажыцьцяўленьне другой часткі суднабудаўнічае праграмы. На 30-е чэрвеня павінны быць закладзены адзін крэйсэр, 6 контр-мінаносцаў, 7 падводных лодак і два пад'ёмных судна.

Ваенная згода паміж Францыяй і Італіяй

РЫМ, 14-3. Агалошан тэкст італа-францускае авіацыйнае згоды, падпісанае ў Турыне францускім і італьянскім міністрамі лётніцтва. Па гэтай згодзе Італія прадастаўляе Францыі права карыстаньня гідрастанцыямі ў Неапалі, а таксама права пералёту праз Калабрыю для простых паветраных зносін з Сірыяй. У абмен за гэта Франція прадастаўляе Італіі права карыстаньня гідрастанцыямі ў Марсэлі і Тунісе для праектаваных паветраных зносін Рым—Тунісе праз Сіцылію або Сардынію. Згода падпісана тэрмінам на 5 год, і калі ні адзін бок на скончэньні гэтага тэрміну ад згоды не адмовіцца, яна аўтаматычна ўступае ў моц на новы пяцігадовы перыяд. У палітычных колах надаюць гэтай згодзе вялікае значэньне.

Арышты ў Навагрудку

ВАРШАВА, 14 III. Водлуг паведамленьняў віленскіх газэт, у Навагрудку адбыліся масавыя арышты сярод камуністычнае моладзі.

Арышт дэпутата сойму.

ВАРШАВА, 14-3. У Вільні арыштован Заявудзкі, дэпутат незалежнае сялянскае партыі, выданы соймам суду.

ПЕРАД ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБОЙ

На першым месцы.

(Ад нашага спэцкора).

Дрыбінскі раён, Аршанскай акругі стаіць на першым месцы па падрыхтоўцы да вясеньняй пасоўнай кампаніі (ачышчана насеньня на 45 проц. заданьня). Тут ёсьць чаму навучыцца астатнім раёнам акругі.

Падрыхтоўка распачалася яшчэ з восені. Сталая агітацыйная праца, шмат агранамічная прапаганда, увязканьне кампаніі за ўзьняцьце ўраджайнасьці з перавыбарамі сельсаветаў, прыцягненьне ўсяго грамадзкага актыву вёскі да гэтага пытаньня далі станоўчыя вынікі.

З студзеня месяца ў кожным сельсавеце распачалі працу, ня гледзячы на вялікія марозы, зернаачышчальныя абозы. Ёсьць сельсаветы, як напрыклад, Бельскі, якія выканалі больш чым на сто процантаў заданьня. Адстаюць пакуль што Гаспадоўскі і Карабскі.

За зіму арганізавана тры буйныя калгасы на плошчы 418 гэктараў. Цікава адзначыць, як клясычны прыклад няжыцьцёвасьці сталыпінскіх хутароў, якія так абаранае кулацкая частка сялянства. Дваццаць тры чалавекі сяляне-хутарцоў Гаспадаўскага сельсавету арганізавалі калектыў на плошчы 170 гэктараў. Дзесяць год жыцьця на хутарох паказалі селянам усю выгаднасьць і карысьць сталыпінскай сыстэмы. Аб'ектыўна гледзячы на формы землякарыстаньня, з пункту погляду эканамічнай выгаднасьці, сяляне паралелі раскрытацца з хутарамі раз і назаўсёды, перайшоўшы на калектыўны лад жыцьця. Значную дапамогу гэтаму рашэньню аказаў эканамічны ўздым камуны «Новае жыцьцё», якая знаходзіцца на суседзкім з вяскоўцамі полі.

Райён узяў жывёлаводчы напрамак у гаспадарцы. А пагэтаму зусім правільна робяць і агранамія, і райземаддзел, калі прымаюць меры да пашырэньня засеву ў пятым годзе карняплодаў і бульбы. Неабходнасьць пашырэньня карняплодаў увайшла ў сьвядомасьць шырокіх пластоў сялянства: у мінулым годзе плошча пашырана была на 70 проц. Трэба спадзявацца, што і ў гэтым годзе, як мяркуе райземаддзел, плошча карняплодаў будзе пашырана на 50 процантаў.

У Дрыбіншчыне, больш чым у другіх раёнах, пашырана культура лубіну. Амаль што ў кожнай вёсцы, асабліва на пасёлках з супясчанай глебай, можна сустрэць гэту расьліну. Сёлета таксама маецца вялікі попыт на насеньне лубіну, але тут сустракаецца перашкода—адсутнасьць у раёне насеньня. На завоз з боку спадзяваецца амаль што немагчыма. Покуль шчэ ня позна, трэба ўзмацніць загатоўкі, хаця-б некалькі сот пудоў нарыхтаваць лубіну.

Аб правядзеньні такіх элемэнтарных рэчаў, як збор попелу, пастановы сялянскіх сходаў па аграмінімуму, папулярызацыя закону ўраду аб падвышэньні ўраджайнасьці і казаць ня трэба, бо яны ў Дрыбіншчыне праведзены ў жыцьцё.

У раёне 32 проц. гаспадарак пераведзены на шматпольны севазвароты. Сёлета будзе пераведзена на шматпольле яшчэ 3100 гэктараў пахаці.

Падрыхтоўка да вясеньняй пасяўной кампаніі зусім не пахожа на падрыхтоўку мінулых гадоў. Сёлета гэта кампанія набывае шырока масавы характар. Установы і арганізацыі накіравалі ўвагу ўсёй грамадзкасьці на ўздым ураджайнасьці. Ад гэтага такі вялікі посьпех у Дрыбіншчыне падрыхтоўкі да сяўбы.

А трыеры маўчаць.

(Калінкавіцкі р., Мазырская акр.).

Распачалася агітацыя. Даклады і даклады «За ўраджай». Гэта пытаньне цэнтральнае нап лёнуме с.-с., на сходах, на пленуме РК ЛКСМБ, на сходзе статкораў, рабселькораў і г. д.

Дзе-ні-дзе пачалі рухацца абозы. Так па Зеляноцкаму с.-с. у в. Кубалаць ачышчана 4 тоны. Але вельмі мала, бо трэ было ачысьціць каля 10 тон. Шмат дзе трыеры маўчаць ужо тыдні і яшчэ гатовы маўчаць месяцы, калі ніхто не падштурхне сонных чынуш—старшынь сельсаветаў.

У в. Матрунках трыер стаіць бяз працы на двары сакратара ячэйкі ЛКСМБ. У Якімавіцкім с.-с. з людзей, хто чысьціць „пена выступае ад працы" (слова статкора на райстаткор нарадзе) ад цяжкасьці круціць, бо трыер ніколі ня мазаўся, няма паса, круцяць вяроўкай. У Сухавіцкім с.-с. трыер з адным сітам, г.-знача на адно вбожжа. Калі сяляне пачалі шукаць сіт, то аказалася, што сіты яшчэ з мінулага году засталіся ў канюшні Калінкавіцкага РВК і там згінулі.

У Аўцюцэвіцкім с-с трыер зусім паломаны і стаіць сіратліва, чакаючы гаспадара.

Даклады, даклады, «гаварыльня». Ня дарам на райнарадах актыву менш слухаюць агітацыі, а больш патрабуюць ад установ рэальнай працы. Неабходна ўсклясьці персанальна адказнасьць за працу трыера, яго цэласьць і ўсё зернаачышчэньне на старшынь с.-с. і КСУ. За зрыў зернаачышчэньня і пасеўкампаніі неабходна караць, як за невыкананьне законаў ураду.

В. А. Сергейчык.

Пляны і іх выкананьне.

«Беда коль пираги начнет печи сапожник»—казаў Крылоў. Ці ня толькі крылоўскія сапожнікі пякуць пляны вясеньняй пасеўкампаніі па Менскай акрузе? А пякуць іх многа (Акрза ўжо зляжыла два пляны, 2 акрселькрэдсаюз, ды яшчэ кожны дзень расылаюць дадаткі), а што-ж выходзе з гэтых печаных плянаў?

Асабліва значная месца ў плянах адводзіцца кантрактацыі.

Вядома рэч, пытаньне надзвычайна важнае. Але здаецца, што з гэтым важным пытаньнем трохі жартуюць, бо быў прысланы адзін плян у студзені ў райёны з прапановай разьмеркаваць па крэдытных т-вах, потым другі ў лютым м-цы в такой-жа прапановай (і невядома колькі яшчэ будзе прысланa).

Што-ж робіцца да выкананьня гэтых плянаў?

Па Бярэзінскаму райёну прапануецца закантрактаваць 200 гэкт. аўса—сартавога, а сартавога аўса ў райёне ня маецца зусім, і прадстаўнік Акрза на нарадзе пры РВК 19-II—29 г. заявіў, што атрымаць насеньне аўса не спадзявайцеся.

Для забясьпечаньня насеньнем аўса кантрактоўшчыкаў вызначан крэдыт на раён у суме 1840 руб. ці 9 р. 20 к. на гэкт. Гэта па лімітных цэнах хопіць на 50 проц., а ў інструкцыі Белсельбанку ад 26-I—29 г. вызначана даць для бядняцкіх гаспадарак і калгасаў на 90 проц. і серадняцкіх на 75 проц. насеньня ў крэдыт.

Наогул справа з аўсом у райёне дрэнная, свайго насеньня ня хопіць, а пра ўвоз ні слуху, ні духу.

Можа з другімі культурамі справа лепей? Напрыклад, з ільном на валакно. Бярэзінскі райён ніколі ільнаводным ня быў і бадай ня будзе (дзякуючы пясчаным і забалочаным глебам), але 40 гэкт. кантрактацыі ільнавалакна і крэдыт вызначылі на 6 р. на гэкт. для забясьпечаньня насеньнем кантрактоўшчыкаў, а ў райёне па гэктару лёну ня сее ні адзін гаспадар, а самае многае 0,25 гэкт. і выходзе, што дзядзька, каб атрымаць 1 р. 50 к. крэдыту, павінен будзе страціць 2 дні (пры цяперашнім становішчы крэдытаваньня).

Неабходна пераглядзець яшчэ раз пляны і зьвязаць заданьні з магчымасьцямі і гэту працу трэба зрабіць як найхутчэй, бо кантрактацыю трэба праводзіць цяпер, а не чакаць пакуль селянін пойдзе сеяць.

У. К—ос.

Ад сонца растайвае сьнег...

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Коханава. Райвыканком. Гадзіньнік паказвае дзевяць, але пакуль — што супрацоўнікаў ня відаць, асабліва «адказных".

У пакойчыку райземаддзелу рэгістратарша — маладзенькая, курчавая дзяўчына перабірае паперы.

Прышоў селянін. Зьняў шапку. —Я да вас. У нашай вёсцы прайшло землеўпарадкаваньне. Арганізавалі арцель па выпрацоўцы цэглы. Ведаеце—перабудова, дык цэгла кожнаму патрэбна. Уступіла ў таварыства 66 гаспадароў.

— А дзе гэта? У якой вёсцы?—запытала рэгістратарша.

— Рэчкай называецца наша вёска.

— Ага, Рэчка. Ведаю.

— От мяне і абралі ўпаўнаважаным. Я прышоў да вас за статутам.

— Няма ў нас статутаў, дзядзька.

— Як гэта няма.

— Няма і ўсё. Трэба запытаць Воршу. Прышлюць праз тыдні два-тры.

— Занадта доўга. Яны-ж павінны быць у вас.

— А калі ня хочаце чакаць—яжджайце «непасрэдствена» ў акрземаддзел.

— «Непасрэдствена», кажаце? Далёка занадта. Статут павінен быць у вас...

* * *

Загадчык райземаддзелу запэўнівае, што да вясны рыхтуюцца здавальняюча.

Ружовы хмель салодкай гутаркі растойвае і з усёй яскравасьцю паўстаюць два словы, толькі два словы—

ПЯТНАЦЦАЦЬ ПРОЦАНТАЎ...

Кажыце што хочаце, запэўнівайце, абгрунтоўвайце, а ўсё такі факт зрыву масеўнай кампаніі захаваць у туман сталецкіх прамоў ня ўдасца.

Праходзілі перавыбары сельсаветаў. Ішла клясавая барацьба беднаты з кулацтвам. Па райёну прайшла хваля ўздыму актыўнасьці ўсёй беднаты і серадняцтва. Чаму ні сельсаветы, ні райвыканком не ўвязалі перавыбарчую кампанію з пераарганізацыяй сельскай гаспадаркі, з узьняцьцем ураджайнасьці, з падрыхтоўкай да вясеньняй сяўбы? Дапытваецца позна.

Сельсаветы і зараз мешкаваты на паваротах, кансэрватыўны да ўсёй сваёй працы. Пытаньне падрыхтоўкі да сяўбы звужаецца да ачысткі насеньня. Ачыстка насеньня гэта пачатковы, прымітыўны спосаб да ўздыму ўраджайнасьці. Калі ня будуць зьнішчаны старадаўнія межы а галоўнае—сярэднявяковая трохполка, калі ня будуць палепшаны балотныя, іржавыя сенажаці—ачыстка насеньня ня тоне ў дзедаўскай сыстэме гаспадараньня.

Закон ураду, важны і гістарычны дакумант, амаль што нідзе не папулярызуецца, не даведзены да мас, для якіх ён выдаваўся. Праект закону па сельска-гаспадарчаму падатку і ўсе зьвязаныя з ім ільготы для гаспадарак, якія выконваюць агранамічны мінімум, у такой-жа знаходзіцца „папулярызацыі".

Райённая пасяўная тройка раз у «абагуленыя» паседжаньні раз у два тыдні. Адзін гэты факт кажа па «баявой падрыхтоўцы» райвыканкому. Суседні Талочынскі райён дае супрацьлеглы прыклад. Там штодзённа, мэтавіта на базовым правяраюцца весткі з пасеўнага фронту. А па Коханаўскаму выходзе, што сельсавет мае права два тыдні нічога не рабіць, два тыдні сядзець злажыўшы рукі і райвыканком нічога ня будзе ведаць...

* * *

На ганках райвыканкому ад сонца растаяў сьнег. Плямы першага бруду лягці на падлогу.

Узыходзе селянін на ганкі, шпіраце рукі ад пакуль-што пятнаццаціградуснага марозу і кажа:

— От і вясна ідзе... Сьнег пачаў таць. Хутка дарога разьмякне.

Райвыканкомаўцы ня чуюць гэтых слоў, як і ня бачаць таяўшага сьнегу. Ідзе сэкратар, ідзе загадчык земаддзелу, падымаецца на ганкі „сам" старшыня і віводзін з іх не прымячае яскравых праменяў сонца і „першай ластаўкі вясны"—таяўшага сьнегу.

Цім. Зарэчны.

М. Коханава, Аршанскай акр.

Вядзецца належная праца.

(Казіміраускі с-с., Жлобінскага р.).

Дырэктыва наконт падняцьця ўраджайнасьці Казіміраускім с-с. праводзіцца вельмі добра.

Ня гледзячы на марозную зіму, на сёнешні дзень ачышчана 620 пудоў збожжа.

Адначасова з гэтым вядзецца растлумачальная праца па падняцьцю ўраджайнасьці; ніводнага сходу сялян не адбываецца без разьвязваньня пытаньня па падняцьцю ўраджайнасьці.

Паводле гэтай працы большасьць насельніцтва захоўвае попел, хаця першым застрэльшчыкам і прыкладам зьяўляюцца сельсавет, настаўніцтва, агранам і вясковы актыў.

Агранам увесь апошні час наглядае за ачысткай насеньня і робіць даклады наконт ураджаю.

Наогул праца распаўсюджваецца тэрмінова і пытаньне па падняцьцю ўраджайнасьці стала на сёняшні дзень галоўным у справе с-с. і ўсіх вясковых грамадзкіх установ.

Пачатая праца вельмі добрая і калі яна будзе так да канца, дык трэба адзначыць, што дырэктыва партыі і ўлады па падняцьцю ўраджайнасьці будзе выканана.

П. Слупскі.

САВГАС—НА ДАПАМОГУ СЯЛЯКАМ.

Ворша, 15-3. Савгас Казечкі, Аршанскае акругі, адпусьціў 1 зернаачышчальную машыну з вопытным рабочым для ачысткі насеньня сялянам вакольных вёсак. Машына пераяжджае з вёскі ў вёску і поўнасьцю нагружана.

Апроч гэтага, калі сяляне з якой-небудзь прычыны ня могуць ачысьціць насеньне ў той час, калі машына бывае ў іх вёсцы, яны вязуць у савгас і там чысьцяць.

Групавы кіраўнік савгасамі Межава-Казечкі, абвясьціў селянам суседняй вёскі Казечына, што калі яны згадзяцца перайсьці на шматпольле, ён вясной успаша сваім трактарам усё іх яравое поле і засее яравы клін сваім гатунковым насеньнем. Сяляне цяпер гэту прапанову кіраўніка савгасамі абгаварваюць і большасьць выказваецца за пераход на шматпольле.

Гнілую віку—на насеньне.

Ходасаўскае спажыўтаварыства, Аршанскай акругі з посьпехам вяло нарыхтоўкі вікі-насеньня. Ня было толькі адпаведных памяшканьняў для захоўваньня вікі. Некалькі разоў праўленьне прасіла Дняпросаюз, каб апошні даў нарады на адпраўку насеньня вікі куды небудзь, дзе яна будзе патрэбна, але ад Дняпросаюзу нічога ня можна было дабіцца і віка ляжала на складзе спажыўтаварыства. Толькі нядаўна Дняпросаюз даў нарад накіраваць віку ў Магілеў—акрсельсаюзу ў якасьці насеньня. А калі там яе агледзелі і апрабавалі, аказалася, што віка—гнілая і ў якасьці насеньня ня прыгодна. Такой гнілой вікі было накіравана ў Магілеў чатыры вагоны.

Цяпер па гэтай справе вядзецца сьледзтва для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці

Аршанец.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Сяляне вітаюць зьезд саветаў чырвонымі абозамі з хлебам.

УЗДА, 13-3. Райённы зьезд саветаў, які адбываецца ў сучасны момант, прыслаў прывітальную тэлеграму ЦК КПБ(б), ЦВК, Менскаму АК КП(б)Б і акрвыканкому, у якой адзначае наступнае:

«На мяжы з капіталістычным сьветам, на вачох заходнязамежных братоў, перамагаючы вялікія цяжкасьці, шпаркім тэмпам адбываецца сацыялістычнае будаўніцтва ў райёне. Шпаркасьць будаўніцтва забясьпечана згуртаваньнем энэргіі працоўных мас пад кіраўніцтвам партарганізацыі».

У час працы зьезду сялянскія дэлегацыі віталі райённы зьезд саветаў і перадалі арганізаваным парадкам хлебазагатоўчым арганізацыям **1300 пудоў зернапрадуктаў.**

Найлепшая і самая танная цэгла.

(Клімавічы, Магілеўск. акр.)

Па аналізу, зробленаму ў Маскве, цэгла клімавіцкага сілікатнага заводу адзначана здольнай вытрымаць прэс у 200 кілёграмаў (пры нормаўтыўнай устойлівасьці для цэглы ў 130 кілёграмаў).

Гэткім чынам, прадукцыя заводу з вялікім посьпехам вытрымала экзамен на якасьць, і збыт яе (для Асінбуду і інш. вялікіх пабудоў) забясьпечан.

Зараз завод ідзе на павялічэньне сваёй вытворчасьці. У мінулы сэзон спробная праца (завод быў толькі што пушчан) дала каля 1 млн. штук цэглы.

Сёлета (з красавіка месяца) завод распачне працу ў тры зьмены, з выпрацоўкай каля 50 тысяч цэглы ў дзень, а ў сэзон—да 8-10 млн штук.

Завод да пуску ўжо гатоў і забясьпечан апаламі і сыравінай (вапнай).

Завод хутка прыступае да пабудовы ўласнай вапельнай печы, якая паменшыць сабекошт цэглы на 40 процантаў, які будзе даведзен да 19 руб. за тысячу штук, пры продажнай цане каля 21 р. (сабекошт бяз вапельнае печы 31 р. за тысячу) і будзе зьнішчана залежнасьць ад увозу вапны з замеж Беларусі (Смаленшчына).

Адначасова будуць дабудаваны дапаможныя памяшканьні заводу: качагарка, харчаўня, мыйніца з душам, а таксама ўстаноўкі для вэнтыляцыі і мэханічнай нагрузкі вапны.

На канчатковую дабудову заводу адпушчана 140 т. р.

Ужо загадзя прададзена з будучай прадукцыі заводу 3 мільёны штук цэглы для Асінбуду, а таксама Белдзярж буду на пабудову фабрыкі штучнага валакна і скуранога заводу ў Магілеве.

Квік.

КРАХМАЛЬНЫ ЗАВОД БЕЗ СЫРДВІНЫ.

Ворша, 15-3. Для Талочынскага крахмальнага заводу, распачаўшага працу з восені мінулага году, стварылася пагроза застацца бяз бульбы. Да 1 лютага на завод паступіла толькі 50 проц. закантрактаванае бульбы і пасьля таго застанавілася гэта паступленьне. Выкананьне па збору закантрактаванае бульбы ідзе вельмі слаба.

Галоўным чынам забясьпечваецца бульбай завод павінен з Талочынскага, Круглянскага і Коханаўскага райёнаў. Але ў гэтых райёнах выкананьне збору бульбы колькі пасоўваецца ўперад. Да гэтага часу Талочынскі райён выканаў толькі 44 проц. збору закантрактаванае бульбы, Коханаўскі—52 і Круглянскі—67 проц. Днепрасаюз, які толькі пасьля пастановы заключыў умову з заводам на дастаўку яму бульбы, з гэта ўжо было позна, з-за марозаў ня мог выканаць умову, бо бульбу падвозіць нельга было. Да гэтага яшчэ патрэбна дадаць, што і Белхарчтрэст, у распараджэньні якога знаходзіцца завод, пастараўся не на карысьць заводу, зацягнуўшы зацьвярджэньне умовы заводу з Днепрасаюзам. У сваю чаргу і Аршанскі акрсельсаюз не клапаціўся і ня прымаў нізкіх мер, каб выканаць кантрактацыю бульбы—збор яе і гэтым забясьпечыць завод сыравінай. Дзякуючы такому становішчу, завод працуе толькі ў адну зьмену, тады як ён павінен быў працаваць у тры зьмены.

У апошні час акрвыканком прымае меры, каб забясьпечыць завод бульбай і даць гэтым яму магчымасьць працаваць нармова. Вінаватыя ў невыкананьні плянаў і стварыўшыя абставіны, дзякуючы якім завод застаўся амаль што без сыравіны прыцягваюцца да адказнасьці

Пленум ЦСПСБ

Падрыхтоўка спэцыялістаў.

Нам. Наркому Асьветы т. **Слонім** зрабіў даклад на тэму—аб падрыхтоўцы спэцыялістаў для розных галін гаспадаркі БССР.

Зараз на ўсіх нашых вышэйшых і сярэдніх навучальных установах навучаецца каля 11000 студэнтаў, але нашу гаспадарку не здавальняе колькасьць спэцыялістаў, якіх выпускаюць нашы ВНУ і тэхнікумы.

На падставе 5-гадовага пляну развіцьця народнай гаспадаркі, Наркамасьветы мае на ўвазе адчыніць шэраг новых вучэбных устаноў і пашырыць існуючыя. Не зважаючы на гэта, усё-ж наша гаспадарка будзе адчуваць недахват спэцыялістаў. Так ВСНГБ на 5 год патрэбна 1097 новых інжынераў і тэхнікаў, а падрыхтаваць зможам толькі каля 800 чал., спэцыялістаў па сельскай гаспадарцы зможам падрыхтаваць толькі 60 проц. патрэбнай колькасьці. Падрыхтоўка настаўнікаў поўнасьцю забясьпечыць узрастаючую сетку школ. Тав. Слонім указвае, якія ўстановы маркуе адчыніць НКА для падрыхтоўкі спэцыялістаў; паміж іншымі будзе адчынен будаўнічы ВТУЗ, хімічны тэхнікум і шэраг іншых вучэбных устаноў.

У нашы ВНУ пралазяць варожыя элемэнты. Але ў апошні год у галіне ўкамплектаваня ВНУ ёсьць некаторыя дасягненьні, і сацыяльны склад студэнцтва палепшыўся. Трэба прыняць меры да максымальнага ўцягненьня рабочых у нашы ВНУ, трэба адчыніць курсы для падрыхтоўкі рабочых у ВНУ, пашырыць сетку вячэрніх рабфакаў і павялічыць стыпэндыі.

З дакладам аб працы прафсаюзаў сярод студэнцтва выступіў т. **Башмачнікаў**. З 11000 студэнтаў у нас палова членаў розных прафсаюзаў, але прафсаюзная праца сярод іх яшчэ кульгае. Трэба павесьці сыстэматычную працу сярод студэнтаў-членаў прафсаюзаў. Многа ў нашых вучэбных установах ёсьць варожага нам элемэнту. К сучаснаму моманту з розных вучэбных устаноў па БССР выключана да 200 такіх студэнтаў. Гэту працу трэба весьці і далей.

У спрэчках па дакладах адзначалася, што пытаньне аб падрыхтоўцы спэцыялістаў яшчэ недастаткова апрацавана. Наркамасьветы за 5 год ня зможа даць патрэбны кадр новых спэцыялістаў, а таму трэба заняцца перападрыхтоўкай старых, трэба падумаць аб падвышэньні іх кваліфікацыі.

Тав. **Рубінштэйн** указвае, што ў Віцебскім каапэрацыйным тэхнікуме сярод студэнтаў многа варожага нам элемэнту. Рабочы ў гэты тэхнікум ня ідзе. У нас вялікая патрэба ў спэцыялістах, а студэнты Віцебскага політэхнікуму накіроўваюцца на біржу працы. Мала аддаецца ўвагі практыкантам—ім не даюць работы па спэцыяльнасьці. Адзначае т. Рубінштэйн і тое, што прафсаюзы не зварачваюць належнай увагі на падбор кандыдатур, якіх накіроўваюць у ВНУ.

Тав. Эстрын зазначае, што ў новых вучэбных установах не вядзецца барацьба з прагуламі студэнтаў, а гэта частае зьявішча.

Тав. Платун гаворыць, што падрыхтоўка настаўнікаў вядзецца слаба, сроднаў на гэта адпускаецца мала. Трэба зьліквідаваць разрыў між ВНУ і нізэйшай школай. З навучальных пляноў трэба ўсё непатрэбнае выкінуць; неабходна зьвярнуць больш увагі на інтэрнацыянальнае і антырэлігійнае выхаваньне.

Тав. Сімановіч указвае, што вячэрнія рабфакі працуюць слаба, бо рабочыя перагружаны грамадзкай працай і з прычыны гэтага адстаюць у вучобе.

Тав. Кулак сьцьвярджае, што Наркамасьветы і ЦСПСБ мала зрабілі для падрыхтоўкі рабочых у ВНУ.

Пэрспэктывы забесьпячэньня рабочых.

На пасяджэньні 14 сакавіка пленум ЦСПСБ абгаварыў даклад Нар. Кам. Гандлю БССР т. **Аксючыца** і садаклад прадстаўніка Белрабсэкцыі аб пэрспэктывах забесьпячэньня рабочых прадуктамі і прамтаварамі.

Тав. Аксючыц пачаў свой даклад з высьвятленьня становішча з хлебам і іншымі прадуктамі. З дакладу відаць, што ў нас ёсьць рэзэрвовы фонд хлеба, якога хопіць для забясьпечаньня насельніцтва БССР на 3 месяцы. Для эканомнага расходаваньня хлеба ўводзіцца суровы нармірваны водпуск апошняга. Цукрам мы забясьпечаны палкам, але з прычыны непарамальнага попыту на апошні, выкліканы чуткамі і плёткамі мяшчанства і варожых нам элемэнтаў, Нар. Кам. Гандлю прымушан быў увесьці нармірваньне і ў продаж цукру. Значна паляпшаецца становішча з забесьпячэньнем маслам. Добра стаіць справа з мясам—загатоўчы плян выкананы на 128 проц. Будзе забясьпечана насельніцтва гарадоў і бульбай, паляпшаецца забесьпячэньне прамтаварамі.

Рабочая каапэрацыя мае запас хлеба—звыш 1000 вагонаў; на сакавік месяц адпушчана 300 вагонаў. Забясьпечаньне крупой рабочай каапэрацыі праводзілася недастаткова, асабліва адчуваецца недахват рысу і манной крупы.

У першым квартале было завезена 70 тон масла, і 61 тону масла рабочая каапэрацыя атрымала ад Белсельтрэсту і малочна-жывёлаводчага саюзу.

У бліжэйшы час забясьпечаньне пайшчыкаў маслам значна палепшыцца.

Налепшылася сёлета і ў далейшым будзе паляпшацца забясьпечаньне пайшчыкаў рабочай каапэрацыі рознай гароднінай

Рабочая каапэрацыя з кожным годам пашырае дастаўку пайшчыкам дроў; у 1928-29 г. мяркуецца закупіць 462000 куб. мэтраў дроў, ці на 40 проц. больш леташняга.

З 1 кастрычніка да 1 лютага рабочая каапэрацыя атрымала 220 вагонаў селядцоў;—у III кварталe будзе завезена 75 вагонаў.

Ня зусім дастаткова адпускае рабочая каапэрацыя алей: так, да 1 сакавіка адгружана 17 цыстэрн; такім чынам, каапэрацыя недаатрымала 11 цыстэрн. На III квартал павінна паступіць 16 цыстэрн.

Прадстаўнік Белрабсэкцыі спыніўся на забясьпечаньні прамтаварамі. У III квартале чакаецца павялічэньне завозу тэкстыльных тавараў. Пэрспэктывы на атрыманьне абутку здавальняючыя. Пашыраецца работа цэрабкопаў па грамадзкаму харчаваньню і хлебапячэньню.

ДЗЕСЯЦЬ ГОД БЕЛАГА ТЭРОРУ.

(Артыкул т. Клары Цэткін да гадавіны Парыскае Камуны).

Паміж белым тэрорам апошняга дзесяцігодзьдзя і жудаснымі эруйнаваньнямі чатырохгадовай імпэрыялістычнай бойні існуе шчыльная гістарычная сувязь. Вялікія канфлікты і злачынствы імпэрыялістычнай буржуазеі паказваюць, што набліжаецца канец яе ўлады. Вольны і бесперашкодны рост вытворчых сіл сучаснае грамады патрабуе пераабсталяваньня сіл сучаснае грамады, патрабуе пераабсталяваньня яе на новых пачатках, выключаючых прыгнечаньне і эксплёатацыю чалавека чалавекам. Аб'ектыўныя прадпасылкі для вызваленьня ўсіх працоўных ад зьневажаючых, цяжкіх умоў буйнае прыватнае ўласнасьці ўжо насьпелі. У думцы чалавецтва насьпяваюць таксама і суб'ектыўныя прадпасылкі для гэтага вызваленьня. Следам за злачынствамі сусьветнага капіталізму набліжаецца гістарычны суд над ім—пралетарская сусьветная рэвалюцыя.

Кастрычнікавая рэвалюцыя зьяўляецца першым магутным і непарыўным зьвяном доўгага ланцугу будучых рэвалюцый, паўстаньняў, масавых грамадзкіх рухаў. Розныя па характару і значэньню, усе гэтыя масавыя рухі маюць адну агульную рысу. У тай ці іншай форме, пры большым ці меншым імкненьні да мэты яны зьяўляюцца стыхійным ці арганізаваным адпорам клясавай эксплёатацыі і ўціску капіталізму. Але поруч з гэтымі масавымі рухамі цягнецца непарыўны ланцуг белага тэрору, які ўжывае буржуазея для прыдушэньня рэвалюцыі. Каты, турмы і суд на службе капіталізму маюць толькі адну мэту: любою цаною, чаго-б гэта ні каштавала, утрымаць рэжым панаваньня меншасьці над усімі працоўнымі. Дзесяць год белага тэрору гэта ясна даводзяць.

Калі ў 1918 г., пасьля паражэньня нямецкага імпэрыялізму, нямецкі пралетарыят пашоў у наступ супроць кіруючых клясаў, буржуазея зараз-жа абарнула супроць яго белы тэрор. Камэндант Бэрліну сацыял-дэмакрат Вэльс загадаў страляць у «чэрнь»—у дэманструючых беспрацоўных і інвалідаў вайны. Сацыял-дэмакрат Носке зрабіўся катам пралетарскае рэвалюцыі. Ён узяў на сябе ролю Мусаліні, ролю ратаўніка буржуазнае ўласнасьці і дзяржавы, ролю абаронцы ўлады буржуазеі. Пад яго кіраўніцтвам рэшткі разьбітае вільгельмаўскае армії з яе афіцэрамі ліквідавалі ня менш, чымся пасьля фашысцкія банды ў Італіі. Сацыял-дэмакраты Эберт і Шэйдэман у імя парадку і дэмакратыі далі сваё блаславаўленьне контр-рэвалюцыйным забойцам.

Крывавы патоп заліў трупы эдраніцкі забітых правадыроў—Розы Люксэмбург, Карла Лібкнэхта і інш. Бязьлітасна была расправа пасьля нізрынуцьця Баварскае савецкае рэспублікі. Люты белы тэрор зваліўся на працаўтарыяў Рурскае вобласьці за іх адважную спробу даць баявы адпор контр-рэвалюцыі ў час Капаўскага паўстаньня. Разьюшана кідаецца ён на рэвалюцыйных барацьбітоў у час паўстаньня ў сакавіку ў Сярэдняй Нямеччыне і лютуе ў 1923 г. у Цюрынгіі і Саксоніі. Адначасова з крывавым тэрорам дзейнічае судовы тэрор. Буржуазная юстыцыя ня толькі фізычна забівае ў турмах, але і топча ўсякі расток вольнай чалавечай масы, усякае імкненьне да культуры.

Стварэньне савецкае рэспублікі ў Вэнгрыі абвясьціла рабочым і сялянам гэтай краіны вызваленьне ад уціску прамысловага і ліхварскага капіталу і абшарнікаў. Але палахлівая і мсьцівая буржуазея і вайсковая кліка патапілі ў моры крыві ледзь нарадзіўшуюся савецкую дзяржаву. Сьмяротныя прысуды і турма на ўсё жыцьцё, прыдушэньне элемэнтарных палітычных свабод і зараз яшчэ зьяўляецца характэрнымі рысамі становішча ў Вэнгрыі.

Чырвоны Кастрычнік 1917 г. даў прыбалтыцкім дзяржавам і Фінляндыі поўную нацыянальную незалежнасьць і самастойнасьць. Эксплёатуемыя рабочыя і абязэдоленыя сяляне чакалі вызваленьня ад эканамічнай залежнасьці шляхам устанаўленьня савецкай улады. Але буржуазея адказала на гэта шалёным тэрорам, якім кіравалі белагвардзейскія авантурысты з старой царской Расеі і нямецкія наёмнікі з рэспублікі Эбэрта—Шэйдэмана—Носке. Імёны Манэргэйма і фон-дэр-Гольца сталі ў Фінляндыі сынонімамі крывавага белага тэрору.

Дэмакраты, меншавікі і эсэры разгарнулі на Украіне шырокі тэрор з мэтаю пры падтрыманьні нямецкае зброі ўзмацніць клясавае панаваньне буржуазеі.

Шляхта і буржуазея панова адроджанай і быццам вольнай польскай дзяржавы, пад кіраўніцтвам Пілсудзкага, самым бязьлітасным тэрорам вішчаць якія-б та ні было спробы да адпору іх рабаўнічай уладзе. Лютымі расправамі адказваюць яны на масавы пралетарскі рух, на імкненьне галодных і змучаных сялянскіх нацыянальнасьцяй палепшыць умовы свайго жыцьця.

Беднасьць і імкненьне да волі штурхнулі італьянскіх мэталістаў да захопу фабрык у верасьні 1920 г. Але іх стыхійны рэвалюцыйны рух быў паралізаваны здрадаю рэфармістаў, у руках якіх знаходзілася прафсаюзнае кіраўніцтва. Гэта паражэньне адчыніла шлях контррэвалюцыйнай дыктатуры буржуазеі і абшарнікаў—Мусаліні. У процілегласьць сваім братом па тэрору ў іншых буржуазных краінах ён, разам з затаптанымі прынцыпамі сацыялізму, адкінуў і званьне сацыяліста. У фашызьме буржуазны рэжым тэрору знайшоў асабліва вострую зброю. У параўнаньні з зьверскімі катаваньнямі, якія церпяць цяпер рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне ад чорнарубашачнікаў, блядзеюць нават катаваньні калісьці барбарамі сваіх ворагаў.

Поруч з злачынствамі італьянскіх фашыстаў стаяць злачынствы белага тэрору ў другой, прэтэндуючай на цывілізацыю, краіне—у краіне шыбеньніц, Баўгарыі. Гэткаму-ж тэрору падпадае рэвалюцыйнае сялянства, рабочыя і нацыянальныя меншасьці ў Румыніі. У фашысцкай Югаславіі цяжкія рэпрэсіі і прасьледваньні душаць усе вылуёныя грамадзкага і палітычнага жыцьця працоўных.

У Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатах, у гэтай краіне «дэмакратыі і волі», пачынаючы яшчэ з 1886 году, калі ў Чыкаго былі павешаны рэвалюцыйныя рабочыя, і да ганебнага пакараньня сьмерцю Сако і Ванцэці, мы маем непарыўны ланцуг актаў белага тэрору — лінчаваньняў, злачынстваў супроць тых, што змагаюцца за свае элемэнтарныя патрабаваньні рабочых.

Нячуваных разьмераў дасягнуў белы тэрор у Кітаі, дзе контррэвалюцыйны Гаміндан, у саюзе з імпэрыялістычнымі драпежнікамі, топіць у моры крыві нацыянальна-вызваленчы і рэвалюцыйны рух шматмільённых кітайскіх мас. А ў калёніях уладарных імпэрыялістычных акул, дзе ненасытныя драпежнікі з мэтраполіі бязьлітасна эксплёатуюць тубыльных нявольнікаў,—там белы тэрор за апошнія гады часта набывае нават характар масавага зьнішчэньня. Досыць успомніць учынкі ангельскіх і францускіх «цывілізатараў» у Індыі, Эгіпце, Сірыі, Марока і іншых калёніях, успомніць, як расправіліся з паўстаньнем у Інданэзіі «міралюбныя» галяндцы.

За гэтыя дзесяць год белы тэрор сусьветнае буржуазеі набыў надзвычайна шырокія разьмеры, але ня стаў мякчэйшым, больш «цывілізаваным». З Эўропы ён перакідваецца ў іншыя краіны сьвету і распаўсюджваецца ўсюды, дзе панае капітал. Ва ўсіх капіталістычных краінах бязупынна працуе гільотына буржуазнае клясавае юстыцыі. Гэта юстыцыя ўсё часьцей ігнаруе нават уласныя законы і набывае характар адкрытага гвалту капіталістаў і буйных аграрыяў. Фашысцкая юстыцыя пачынае ўжываца далёка за яе межамі. Яе мэтады ўжываюцца ўжо ў Баўгарыі і Югаславіі. У Польшчы, пры падтрыманьні польскае сацыялістычнае партыі (ППС) яе функцыі бяруць на сябе легіянэры Пілсудзкага. «Чорны Рэйхсвэр» і «Сталёвы Шлем» у Нямеччыне, «Хэймвэр» у Аўстрыі таксама чакаюць моманту, калі яны змогуць выявіць сябе ў вялікім маштабе.

Буржуазея вярбуе ў свае шэрагі таксама і жанчын. У Італіі і Фінляндыі ўжо даўно ёсьць жаночыя фашысц

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

У паходзе за ўраджай.

(Ліст з Бабруйшчыны).

Наша савецкая школа навіна практычна ўдзельнічаць у справе падняцьця ўраджайнасьці, у прыватнасьці ў падрыхтоўчай працы да веснавой сяўбы. Вось аб гэтым практычным удзеле школы ў справе падняцьця ўраджайнасьці на Бабруйшчыне і будзе ісьці гутарка ў гэтым лісьце.

Школы распачалі працу. Вось прыклады іх працы.

Вучні **Сьвіслацкай сямігодкі** арганізавалі чатыры вучнёўскія брыгады, паслалі іх на вёску, здаволіўшы сельска-гаспадарчай літаратурай. На вёсцы вучні вядуць шырокую растлумачальную працу па падрыхтоўцы да сяўбы.

Гэта, так сказаць, праца чыста агітацыйнага характару. А вось **Гарбацэвіцкая сямігодка** арганізавала збор попелу сярод сялянства для ўгнаеньня свайго школьнага вучастку і палёў сялян беднякоў.

Такое-ж мерапрыёмства актыўна праводзяць і вучні **Дараганаўскай школы**, Стара-Дароскага райёну. Тут нават у працу ўцягнуты малышы—вучні 1 і 2 групы, і трэба сказаць, вынікі працы добрыя.

Возьмем **Гарадкоўскую сямігодку**. Ужо вучні сумелі сабраць больш паўсотні пудоў попелу, а да вясны яны жыркуюць сабраць яго ня менш, як дзьвесьці пудоў. Апрача таго, вучні школы ўдзельнічаюць у правядзеньні вачысткі насеньня.

Парыцкая школа сялянскай моладзі ў сваёй працы па падняцьцю ўраджайнасьці не абмяжоўваецца зборам попелу і агітацыяй. У плян працы гэта школа ўнесла і такія моманты, як пратручваньне насеньня, запладка парнікоў у сялян для атрыманьня раньняй капусты, насадку садовых дрэў у сялян і г. д. і г. д.

Але асабліва вялікую працу правяла ў гэтым напрамку **Жлобінская сямігодка**. Па-першае—яна правяла праз сваіх вучняў (удзельнічала 160 вучняў) выпрабаваньне якасьці насеннага матар'ялу ў сялян-бацькоў вучняў і гэтыя вынікі апублікавала ў акруговай газэце «Камуніст». Вынікі паказалі, што насеньне ў некаторых сялян засьмечана напалову.

Гэта-ж школа праз вучняў вядзе вучот падрыхтоўкі да пасеўкампаніі на вёсцы; яна арганізавала спэцыяльную с-г. бібліятэку для карыстаньня бацькоў вучняў. Вучні гэтай школы правялі працу па папулярызацыі пастановы СНК аб мерапрыёмствах па падняцьцю ўраджайнасьці, арганізоўваюцца вучнёўскія дружыны дапамогі беднаце ў час пасеву.

Апрача таго, школа арганізавала для вучнёўскага актыву спэцыяльныя сельска-гаспадарчыя курсы, распачала пры дапамозе вучняў праверку ўсхожасьці насеньня ў сялян.

Школа ўзяла шэфства над 2-мя суседнімі вёскамі па падрыхтоўцы да сяўбы і правяла яшчэ шмат карысных мерапрыёмстваў па падняцьцю ўраджайнасьці.

Гэтыя прыклады ўдзелу школ у падрыхтоўцы да сяўбы навінны зьявіцца прыкладам для іншых школ, асабліва вясковых, якія яшчэ слаба ўцягнуты ў працу па дапамозе сялянству ў падрыхтоўцы да сяўбы.

А. Дамброўсні.

Вучні зьбіраюць попел.

Пакараньне за пабоі дзяцей.

Гэтымі днямі ў горадзе Амсьціслаўлі выязная сесія слухала вельмі цікавую для ўсяго настаўніцтва справу па абвінавачваньню выхавацеляў Пустынскага калектыву ў пабоях выхаванцаў.

Пустынскі калектыў склаўся ў пачатку восені мінулага году і складае частку Амсьціслаўскага дзіцячага гарадка. Пустынкі—былы манастыр, ад якога захаваліся часткай будынкі. І туды было накіравана каля 400 дзяцей школьнага і дашкольнага ўзросту. На такі лік дзяцей будынкаў было мала, а таму цесната была значная, нават і для ізаляцыі хворых ня было належнага мейсца. Напалі на працу туды і маладыя настаўнікі: Харкевічы П. і Зьм., Зылькоў і Сяргееў. З энэргіяй пачалі яны весьці сваю выхаваўчую працу. Але ня ўсе настаўнікі калектыву дапамагалі ім. Пачаліся раздоры, спрэчкі. Адна за другой выяжджаюць туды камісіі, асобныя прадстаўнікі саюзу і адміністрацыі. І ў выніках—судовая справа: неабходна было ўскрыць балячку. І суд гэта зрабіў.

Як высьветлілася на судзе, маладыя настаўнікі Харкевіч П. і Зылькоў ня вытрымалі і для большай пасьпяховасьці пачалі ўжываць меры фізычнага ўзьдзеяйнічаньня: зьнімалі вопраткі з тых дзяцей, якія адмаўляліся ісьці ў школу. Зылькоў нават біў па твары; вадзілі некаторых дзяцей у падвал, білі рэмнем, гналіся за ўцёкшымі выхаванцамі з вінтоўкай. Віноўнасьць двох іншых настаўнікаў—Харкевіча З. і Сяргеева—не ўстаноўлена і яны судом апраўданы.

Для Харкевіча П. і Зылькова суд вынес прыгавор: пазбавіць волі на адзін год, але прымаючы пад увагу, што яны зьяўляюцца працоўнымі, кару панізіць на палову і лічыць умоўнай з двохгадовым іспытаньнем. Так пралетарскі суд расцаніў паступак вінаватых.

Які адгэтуль вынік для ўсіх настаўнікаў і ў прыватнасьці для тых, хто працуе ў дзіцячых установах? Ці ёсьць чаго палохацца, што некаторыя нападаюць у падсудзьня і нясуць кару? Не, палохацца ня трэба. Гэты прыгавор павінен быць папярэджаньнем для тых настаўнікаў, якія яшчэ не адмовіліся ад старой закваскі рукаприкладзтва. Настаўніцтву трэба ведаць, што дзеці ня родзяцца злачынцамі, як казаў на судзе Харкевіч П., што пад уплывам дрэнных умоў яны часова робяцца такімі. А таму задача выхавацеля—цяжкім трудом, ласкай, разумным падыходам дапамагаць дзяржаве перавыхоўваць тых бяспрытульных, якія знаходзяцца ў дзіцячых дамох. Відома, што ўмовы працы там цяжкія, што пэнсія малая, але гэта не дае права біцца.

Той частцы настаўніцтва, якая працуе ў школах, куды наведваюцца выхаванцы дзіцячых устаноў, скарыстаць максымум энэргіі на дапамогу выхавацелям.

Мясцовы.

Дапамагаем беднаце.

(Крупіцкі с.-с., Самахвалавіцкага р-ну, Меншчына).

Камісія дапамогі біднейшым вучням Дубіцка-Слабадзкой школы значна разьвінула сваю працу. Асабліва добрасумленна працаваў сябра камісіі Галенчык Васіль, які ў сваёй вёсцы сабраў каля 9 руб. Абыходзячы па хатах з падпіснымі лістом, камісія сабрала 11. руб. Камісія таксама арганізавала лётарэю, якая дала 14 руб. 18 кап. Крупіцкі камітэт узаемадапамогі адпусьціў 5 р. Самахвалавіцкі райвыканком адпусьціў 30 руб., а ўсяго сабрана ў фонд дапамогі біднейшым вучням 60 р.18 к.,

За сабраныя сродкі камісія купіла і пашыла беднаце 7 сьвітак, 3 зімовыя шапкі, купленна тавару на 2 нізы пад боты і 1 верх таксама на боты, 2 скураных лапцаў, 3 дзіцячыя касьцюмы, 2 сукенкі і 4 хусткі.

У далейшым камісія пастанавіла набываць сродкі праз арганізацыю лётарэі, пастаноўку спэктакляў, ахвяраваньні і інш. Пасьля дапамогі значна палепшылася наведваньне школы беднатой.

А. Р.

Дашкольнікі на радыё-станцыі.

(Менская сямігадовая школа № 20, імя 10-цігодзьдзя БССР.)

Міжнародны Жаночы Дзень. Дзеці, як звычайна, зьявіліся ў школу к 9-ай гадзіне раніцы. Настрой у іх сьвяточны. «Ці хутка пачнецца раніцнік, ці хутка мы будзем выступаць з дэклямацыяй і сьпевамі ў школе і на радыё-станцыі?»

Для акцябрат-вучняў О гр. гэта—нябывалае здарэньне. З вялікім захапленьнем і ўздымам яны прымалі ўдзел у раніцніку для малодшага канцэнтру.

Пасьля аб'явы настаўніцы, што вучням О гр. і тром дзяўчынкам з 1 і 2 кл. неабходна зьявіцца ў школу а 4 гадзіне, каб яшчэ раз прарэпэтыраваць нумары сьпеваў і дэклямацыі, якія будуць выконвацца на радыё-станцыі, дзеці літаральна пачалі скакаць ад радасьці. Сабраліся яны ў школу яшчэ а 3-ай гадзіне разам з матамі, сёстрамі і цёткамі

Захапіліся гэтым выступленьнем ня толькі дзеці, але і іх бацькі і настаўніцтва школы.

Настроіўшыся ў доўгую калёну, усе разам пашлі на радыё-станцыю.

Праз некалькі хвілін перадача пачалася прамовай настаўніцы тав. Шумлянковай. Дзеці і іх бацькі, якія сядзелі ў кантрольным пакоі, уважліва і сурёзна слухалі. Пасьля прамовы дзеці прасьпявалі беларускую марсальезу, выконвалі некалькі нумароў дэклямацыі на тэму дня.

Бацькі дзяцей ні разу ня бачылі радыё-станцыі, а ў гэты дзень яны азнаёміліся гэтальна, зацікавілі настаўніцы за працу і прасілі дапамагчы ім устанавіць радыёпрыёмнікі ў сябе дома.

На сродкі, выручаныя ад выступленьня вучні О класы хочуць пастаўіць радыёпрыёмнік з гучнагаварыцелем у школе.

Н-ш.

Вынікі няўдалага адміністраваньня.

(Вільчыцкая ШСМ, Койданаўскага р. Менская акр.).

Разам з дасягненьнямі ў працы Вільчыцкай ШСМ ёсьць і недахопы як па гаспадарды, так і з пэдагагічна-выхаваўчага боку. Сад запускаецца, змаганьне са шкодлівымі саду не разгорнута. Каровы ўбытачныя.

Саломы для подсьцілу даўно няма, бо патрэба ў саломе загадзя не падлічана. Племянны кныр ужо болей васьмі месяцаў скрабецца ў каросьце. Племянной сьвіньні недзе было парасіцца, і яе зьмясьцілі ў клюб. Галоўны будынак школы адрамантавалі дрэнна: падлога і столь апускаюцца, падлога падгніває і правальваецца. Печкі перакладаюць кожны год і пасьля кожнай перакладкі траскаюцца, дымяць.

З боку рабочых, служачых і вучняў былі ўказаньні на недахопы.

Пісалі ў газэты як цэнтральныя, так і насьценную, але «крытыкуноў» зацёрлі, і ўжо на працягу 7-8 месяцаў ціха, ні крытыкі ні самакрытыкі ня чуваць. Апошні раз у кастрычніку 1928 г. у насьценнай газэце трохі ўказалі на недахопы, але за гэта, кажуць, дасталося рэдактару, і прыблізна з таго часу насьценная газэта няма.

Па прафсаюзнай лініі таксама цішыня; вытворчых нарад амаль што няма, можа таму, што сама загадчыца—старшыня вытворчай камісіі, а яе намесьнік—прафпаўнаважаны.

Выхаваўчая праца вучняў і рабочых наладжана слаба. Адміністрацыя ўжо выхаваўчую працу падмяняе вымовамі—строгімі, простымі, таварыскімі, карамі, палоханьнем і г. д. У выніку з боку вучняў адчуваецца пасыўнасьць, забітае раўнадушша.

У апошнія часы ў школе здарыліся пажары, два будынкі згарэлі; будынкі не зьстрахаваны. Тут таксама шмат нядбайнасьці з боку адміністрацыі.

Каб зьнішчыць усе недахопы ў далейшым, трэба: ажывіць працу вытворчых нарад; ажывіць самакрытыку; выпускаць насьценную газэту; пакаральны мэтад зьмяніць пэдагагічна-выхаваўчым; набыць для школы больш літаратуры, у тым ліку абавязкова творы Леніна, аб чым вучні просяць ужо тры гады.

И. П.

З лістоў.

Рэчыцкі райвыканком прапасьвоты (Гомельшчына) зьвярнуўся з адозвай да настаўніцтва райёну аб неабходнасьці выпіскі і распаўсюджаньня «Савецкай Беларусі». Лёзунг раймясцкому—кожны асьветнік, выпішы «Савецкую Беларусь» і стань антыўным яе дапісчыкам.

— У бытнасьць хатніка Астрашэўскага Мала-Сьмецянская х.-чытальня (пад Менскам) шырока разьвінула працу. Але з восені 1928 г. у х.-чытальні пераміняліся аж тры хатнікі, якія зьнялі яе чыннасьць на нішто: гурткі пераскідаліся, радыё змоўкла, насьценгазэта выходзе рады ў гады. Сляпства адшатнулася ад х.-чытальні.

— У Нацкай 2-хкамплектнай школе (Ірупскі р., Арш. акр.) ёсьць шмат вучняў 18-цігадовага ўзросту. Гэтыя 18-цігадовыя «дзеці» дэмаралізаваныя і сваімі хуліганскімі выхадкамі псуюць іншых вучняў. Настаўніцтва ня можа справіцца з хулігамі.

— Вучні Гарадзеяскай сямігодкі (Рагачоўскі р., Бабр. акр.) арганізавалі школьны канцэрваты, які ахапляе каля 50 проц. усіх вучняў. Пай для вучняў II-га канцэнтру—25 к., для 1-га—20 кап

Наша пераліска.

П. І. Карнамыцнаму. Чавусы. Ваш ліст пераслалі ў Цэнтральную Раду Т-ва «Прэс пялісьменнасьць» з просьбай даць вам адказ.

С. М. Бяларучы. Артыкул «За ажыўленьне актыўных мэтадаў выкладаньня прыродазнаўства» нічога канкрэтнага не дае, а толькі пераказвае ўсім вядомыя азы. Пажадана было-б, каб вы напісалі, як у вашай школе пастаўлена справа ў гэтай галіне.

Антонаўцу. Чырвоны Бераг. Школьныя вучасткі здаюцца ў арэнду не на жаданьню настаўніцтва. Друкаваць ня: будзем.

П. Даўгала. Чэрвень. Допіс «З практыкі 1-ай чэрв. бел. сямігодкі» пераслана ў часопіс «Асьвета».

Язэпу Чаромуха. Смалявічы. Допіс „Гандляры і спэкулянты вучацца ў савецкіх школах" пераслалі ў НК РСІ дзеля прыняцьця належных мер.

М. С. Бабруйск. Допіс «Не раскрапанчэньне, а закрапанчэньне жалчыні» пераслалі ў Бабруйскую акр. пракуратуру.

А. П. Сьмілавічы. Допіс «Даволі пярэнць» пераслалі ў Мен. акр. інспэктуру нарасьветы.

Вытворчыя агляды і ўдарныя групы— НА ДАПАМОГУ ВЫТВОРЧАСЬЦІ.

(НА МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ).

Шмат адмоўных зьявішчаў было ў працы на менскай абутковай фабрыцы. Былі выпадкі значнага процанту браку, недастатковая праца вытворчых нарад, парушэньні працоўнай дысцыпліны, а часамі некаторыя і тэхнічныя недахопы, якія рабілі адмоўны ўплыў на вытворчасьць працы ў розных цэхах.

Усе гэтыя недахопы рабочыя бачылі штодзённа і паматалі аб іх добра, гутарылі між сабой, выказвалі адзін другому свае думкі, як іх зьнішчыць, як палепшыць вытворчасьць, але на гэтым гутарка і канчалася. Скруціўшы цыгарку з махры, разыходзіліся па хатах, бо ня было каму выслухаць, падагуліць іх думку, а ў выніку ажыцьцёвіць.

ПРАЦА ВЫТВОРЧЫХ НАРАД І КАМІСІЙ НЯ ЦІКАВАЯ.

Існуючыя на гэтай фабрыцы вытворчыя нарады і вытворчая камісія рэгулярна не працавалі, і, такім чынам, з-пад іх кіраўніцтва адрываліся хвалюючыя рабочых пытаньні.

Вытворчая камісія складзена зусім няўдала, не па цэхах, у выніку чаго часамі немагчыма зьнішчыць на месцы дэфэкты, якія назіраюцца ў штодзённай працы.

Не адчуваецца адказнасьці за працу ў кожнага сябра камісіі, абавязкі між імі не разьмяркованы.

Апошні час камісія працавала зусім бяз пляну; затое плян, складзены на 1-ы квартал, так нагружаны, што яго трэба было выконваць у працягу паўгода, а «сьпешка» яго рэалізацыі, такім чынам, прывяла да ня зусім добрых вынікаў.

На пасяджэньні, якія к таму-ж праводзіліся нерэгулярна, рабочы актыву не заклікаўся.

Пастановы, якія былі часамі і карысныя, на вытворчых нарадах не зацьвярджаюцца,—і рабочыя па гэтай прычыне зусім ня ведаюць, што робіць камісія.

Вытворчыя нарады—таксама маюць свае недахопы: нерэгулярнае іх скліканьне, адсутнасьць вучоту тых прапаноў, якія ўносяць рабочыя, невыкананьне адміністрацыяй пастаноў, прынятых нарадай.

Звычайна адміністрацыя выконвае ў кожную чаргу тыя пастановы, якія яна ўносіць сама і маркуе іх ажыцьцёвіць, а прапановы рабочых на камісіі і нарадах адміністрацыяй адцягваюцца.

ВЫТВОРЧАЯ ДЫСЦЫПЛІНА І ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ.

Дзякуючы гэй плённай выхаваўчай працы, якую праводзяць ячэйка КП(б)Б, ячэйка камсамолу і прафарганізацыі, рабочыя добра ўявілі сабе важнасьць дысцыпліны, уважлівых адносін да вытворчасьці; пагэтаму былыя калісьці адзіночкамі рабочыя адчуваюць сябе ў гэтым вялікім калектыве гаспадарамі і дбаюць самі аб падвышэньні якасьці прадукцыі, аб падняцьці дысцыпліны.

Характэрна адзначыць, што ў гэтай фабрыцы, дзе ёсьць каля 200 рабочых, зусім не назіраецца злосных прагулаў. Напрыклад, у лютым гэтага году ўсе 100 проц. рабочых зьяўляліся на працу.

Што датычыцца выробленай прадукцыі і яе якасьці, дык яны здавальняючыя. Па апошніх падліках, якія былі ў канцы мінулага году, процант браку зьмяншаецца з кожным месяцам.

ВЫТВОРЧЫ АГЛЯД ПАДЫМЕ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ І ДЫСЦЫПЛІНУ.

Сярод станоўчых фактаў—падняцьце вытворчасьці, здавальняючая дысцыпліна і інш.—ёсьць і адзінкавыя выпадкі адмоўнага парадку. Былі, напрыклад, і такія, калі адзін рабочы сьвядома псаваў машыну; баючыся канкурэнцыі, не хацеў прывучаць моладзь да кіраваньня машынай. Пасьля перагу рэлярэдзваньняў прадпрыемства прымушана было яго выключыць.

Ёсьць, напрыклад, ва ўсім калектыве адзін рабочы М., выключаны з КСМ, які за кароткі тэрмін мае 9 вымоў за парушэньне вытворчай дысцыпліны і за нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў.

У часе працы на вытворчасьці рабочыя часта сябруюць з «натам», падрываючы ім майстра...

Гэтыя адмоўныя факты ў жыцьці рабочых, а таксама і жаданьне яшчэ лепш падняць вытворчасьць падштурхнулі рабочых арганізаваць вытворчы агляд.

Абраная ў ліку 10-ці асоб камісія працуе ўжо ў працягу 2-х месяцаў, дакладна вывучаючы самыя дробныя адмоўныя зьявішчы на фабрыцы.

На час агляду камісія супольна з рэдкалегіяй насьценнай газэты выпускаюць газэту па агляду, якую рабочыя засыпаюць дзесяткамі карысных прапаноў, як палепшыць тое ці іншае ў кожным цэху.

Рабочыя ўнесьлі 65 практычных прапаноў, частка з якіх будзе прэміравана дзякуючы сваёй каштоўнасьці. Частка гэтых прапаноў, не чакаючы вынікаў агляду, адміністрацыяй ужо ажыцьцяўляецца.

Камісія ў працягу 2-х месяцаў заснавала штодзённае дзяжурства ў клюбе ў часе абеду і ўвечары: правяла нарады ва ўсіх 4-х цэхах па пытаньнях падняцьця вытворчасьці, якасьці прадукцыі і вытворчай дысцыпліны.

Вынікі гэтага агляду відавочны.

Згодна заявы дырэктара заводу і яго намесьніка, процант браку, які быў да арганізацыі агляду—0,3 проц. зараз, за час вытворчага агляду, зусім ня мае месца на фабрыцы.

НАСЬЦЕНГАЗЭТА І ФОТАГУРТОК ДАПАМАГАЮЦЬ.

Поруч з працай камісіі па вытворчаму агляду, насьценная газэта высунула цікавую ідэю арганізацыі **ўдарных брыгад** на вытворчасьці. Гэту ідэю падтрымаў фота-гурток, які працуе пры клюбе фабрыкі.

Мэта ўдарных брыгад—выкрываць усе адмоўныя зьявішчы ў жыцьці і працы фабрыкі, выяўляюць рабочых, якія нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў, дапамагаць у справе палепшаньня якасьці прадукцыі, зьмяшчаць фота-здымкі ў насьценнай газэце браку і тых, хто гэты брак па нядбайнасьці зрабіў.

Ажыцьцяўленьне гэтага значна дапаможа палепшыць працу на фабрыцы, дапаможа замацаваць і ажыцьцёвіць тыя мерапрыёмствы, якія выпрацуе вытворчы агляд

Рабочы.

КУТОК РАБСЕЛЬКОРА.

Рабселькор павінен быць пісьменным і тэарэтычна падкаваным.

Рост актыўнасьці працоўных мас параджае і рост рабселькораўскіх шэрагаў. У шэрагі рабселькораў улівацца ўсё новы і новы маладняк, які не прайшоў яшчэ школы рабселькораўскага выхаваньня, для якога яшчэ задачы рабселькораў ня зусім ясныя і зразумелыя. Ды і для «старога» рабселькора часта не заўсёды ясны штодзённыя задачы яго працы, бо наша жыцьцё, наша будаўніцтва так хутка рухаецца ўперад, высоўваючы перад працоўнымі масамі і тым больш перад савецкім друкам усё новыя і новыя задачы, за якімі бывае вельмі цяжка ўгнацца.

Але савецкі друк, які зьяўляецца агітатарам, прапагандыстам і арганізатарам працоўных мас закон сацыялістычнага будаўніцтва, ня можа дагнацца ў хвасьце гэтых задач, ён павінен ісьці ўперадзе, мабілізаваць і прыцягваць да гэтай справы шырокую грамадзкую думку.

Рабселькоры зьяўляюцца душою газэты, а разам з гэтым яны павінны быць і ў курсе тых задач, якія стаяць перад савецкім друкам. Гэта можа быць дасягнута толькі тады, калі рабселькор будзе працаваць над сабой, вучыцца і ўдзельнічаць у практычным будаўніцтве сацыялізму.

IV усесаюзная нарада рабселькораў указвала распрацавала задачы рабселькораўскага руху на бліжэйшы час пад пунктах гледжаньня сучаснага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў нашай краіне, а таксама і пытаньне інтэрнацыянальнага выхаваньня рабселькораўскіх шэрагаў.

Вось чаму трэба абавязкова прапрацоўваць пастановы і рашэньні гэтае нарады.

Пастановы і рашэньні нарады павінны быць заўсёды пад рукою рабкора і селькора, пад рукою кожнай рэдкалегіі насьценгазэты, кожнага рабселькораўскага гуртка.

Без практыкі няма тэорыі, без тэорыі няма практыкі. Пастановы нарады выходзяць і з практыкі сацыялістычнага будаўніцтва і зьяўляюцца тэарэтычным падагульваньнем чарговых задач, таму не павінна быць ніводнага рабселькора, які-б уважліва не распрацаваў гэтых пастаноў.

Прапрацоўваем пастановы рабселькораўскай нарады.

Рабочыя і сялянскія карэспандэнты Калінкавіцкага райёну ўжо пачалі прапрацоўваць рэзалюцыі і пастановы, а таксама знаёміцца з вынікамі ўсесаюзнай нарады рабселькораў.

10 сакавіка ў гор. Калінкавічах адбылася райённая рабселькораўская нарада, на якой пытаньні IV усесаюзнай нарады занялі цэнтральнае мейсца. Пытаньне гэта абгаварвалася больш пяці гадзін. З спрэчак выявілася, што яшчэ і да райённай нарады некаторыя селькораўскія гурткі (Даманавічы) прапрацоўвалі даклады, якія былі на ўсесаюзнай нарадзе, а таксама пачалі прапрацоўку рэзалюцый і пастаноў зьезду.

На райённай нарадзе асабліва былі завостраны пытаньні аб барацьбе з шкодлівымі сацыялістычнага будаўніцтва, аб выкарчоўваньні з савецкага апарату бюракратызму і валакіты.

На нарадзе таксама быў заслухан даклад прадстаўніка рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь" аб вывезьдзе агляданае рэдакцыі і аб задачах правядзеньня агляду. Выступаючыя на дакладу таварышы ўхвалілі новыя мэтады працы рэдакцыі „Савецкая Беларусь", запрашалі рэдакцыю ў свае глухія вёскі і абяцалі дапамогу ў правядзеньні гэтае важнае справы.

На вялікі жаль на нарадзе ня было ніводнага агранома і такія важныя пытаньні, як падрыхтоўка да сяўбы, узьнясьце ўраджайнасьці былі закрануты недастаткова. Гэта адзін з буйных мінусаў у рабоце нарады.

У практычнай працы селькораў гэты недахоп трэба выправіць і паставіць пытаньне ўраджайнасьці і падрыхтоўкі да сяўбы ў парадак дню рабселькораўскай працы.

В. З.

Узмацніць парткіраўніцтва.

У нашай вёсцы Чэбатовічах, Уваравіцкага р. быў арганізаваны селькораўскі гурток, у які запісалася 15 чалавек. Спачатку праца гуртка ішла досыць добра. Селькоры пры хаце-чытальні выпускалі насьценную газэту, якая цікавіла сялян. Зараз кіраўнікі селькораўскага гуртка паехалі вучыцца на рабфак і гурток пачаў распадацца. Загадчых хаты-чытальні т. Мядзюлянаў работаю ня цікавіцца і селькоры без кіраўніцтва.

Партарганізацыі неабходна ўзяцца за кіраўніцтва селькорамі. **Селькор.**

Селькоры за вучобай.

Для таго, каб кожнаму рабселькору быць у курсе спраў рабселькораўскага руху ў СССР і за межамі, неабходна як след прапрацаваць пастановы IV усесаюзнай рабселькораўскай нарады як індывідуальна, так і ў гурткох. Наш В.-Крушынаўскі гурток за распрацоўку гэтых пастаноў ужо ўзяўся. Заняткі праходзяць па праграмезьмешчанай у газэце „Зьвязда". Ужо прапрацавалі даклад Ульянавай «Вынікі і перспэктывы рабселькораўскага руху СССР». Усваеньне распрацованага матар'ялу здавальняючае. Селькоры з здавальненьнем вывучаюць гэтыя пастановы, каб пратварыць іх у жыцьцё.

Я. Крушына.

Рагачоўскі р., в. Крушына.

„Чырвонае Шыла" № 1 (126).

(Друкарня БДВ.)

Пяць год (125 нумароў) газэта была насьценнай.

Выходзячы ў два тыдні раз, яна была фокусам, у якім адбівалася усё грамадзкае жыцьцё прадпрыёмства.

„Чырвонае Шыла" ў працягу пяцёх год была на чале ўсіх кампаній, якія праводзіліся ў друкарні, яна выяўляла ўсё здаровае і хворае, усё добрае і дрэннае, што наглядалася на прадпрыёмстве.

І вось мы бачым, што 126-ы нумар ужо ня вісіць на сьцяне, а па прыкладу іншых буйных фабрык і заводаў, выходзіць друкаваным з тыражом у 500 экземпляраў.

Нумар займае 4 старонкі сярэдняга фармату. З надворнага боку газэта робіць досыць прыемнае ўражаньне: добры падбор шрыфтоў, ня дрэнная вёрстка, ёсьць заметкі на нацыянальных мовах. На першай старонцы прывітаньні ад фрунзаўскага райкому КП(б)Б, ад ЦП саюзу друкароў, ад рэдакцыі газэты „Октябр" і інш, але чамусьці ўсе прывітаньні, за выключэньнем «Октябрэ» на расейскай мове.

Газэта выйшла 8-га сакавіка, і гэтым вызначаецца яе характар, яна ўся прысьвечана жаночае-работніцы, за выключэньнем маленькага аддзелу на чацьвертай старонцы „агляд вытворчых нарад".

Ня зусім добра тое, што ў газэце няма ніводнага малюнку.

Таксама здасьцца, друкары навінны-былі ведаць пану друкаванага слова, і ў сваёй уласнай газэце, як прыклад навіны былі-б ухіляцца ад граматычных памылак. Але дзе вы бачылі. Яны сустракаюцца на кожным кроку. Нават яны пралезьлі і ў загалоўкі.

Ну, а як рэдагаваньне. Ёсьць артыкулы і заметкі стыльныя, вытрыманыя, але побач з імі ёсьць заметкі зусім сырыя, незапрацаваныя, амаль што нялісьменныя.

Мы добра ведаем, што пісаць у газэту навінны і дасьтаныя і малапісьменныя рабочыя, але на тое-ж ёсьць рэдкалегія, каб рэдагаваць, каб выпраўляць, каб надаць заметкі выгляд зручны для чытаньня.

Далей, загалоўкі і тыя не заўсёды дапасаваны да зьместу. Напрыклад: загаловак перадавіцы „Чаму 8-е сакавіка" нейкі дзіўны і не падыходзячы да зьместу.

Мы ўжо ня кажам аб тым, што месца перадавіцы маглі займаць артыкулы больш сур'ёзныя і актуальныя, як артыкулы: Сапожнікава «Роля жанчыны ў сацыялістычным будаўніцтве», альбо Аронавай «Задачы сёньняшняга дня».

Такім чынам, мы бачым, што першы нумар ня зусім на вышыні. Але на тое гэта і першы.

Задачы і запатрабаваньні да друкаванай газэты значна большыя, чымся насьценнай і ў сувязі з гэтым ёсьць пэўныя цяжкасьці. Але каб пераматы ўсе цяжкасьці і зьнішчыць пералічаныя недахопы, патрэбна: калегіяльнасьць—рэдкалегіі больш уважліва адносіцца да рэдагаваньня заметак, пакрытае—трэба пазбавіцца з адной з мясцовых газэт, каб тая крыяла шэфства, ці неяк другім чынам прыняла ўдзел у выданьні газэты. Каб яна выпучыла з сваіх супрацоўнікаў таварыскай, якія-б дапамагалі рэдкалегіі. Тады газэта стане на ногі і будзе прыкладным органам рабочых.

Л. С-р.

ЗУЕЎ--АКТЫЎНЫ ГРАМАДЧЫК.

Прэзыдыум Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі разглядаў справу аб прасьледваньні рабкора Зуева ў сувязі з заметкамі ў розных газэтах.

Прэзыдыум адзначыў, што факты, зазначаныя ў зьмешчаных заметках аб дыскрэдытацыі карэспандэнта Зуева з боку некаторых працаўнікоў Аршанскай акругі, як-та: т. Рубенчыка, Вішнеўскай і Красьнікава, адпавядаюць сапраўднасьці. У пастанове падкрэслена, што т. Зуеў прымаў актыўны ўдзел у рабкораўскім руху ў працягу некалькіх гадоў, таксама зьяўляецца дабрахвотнікам Чырвонай арміі, у якой ён праслужыў 7 гадоў. Абвінавачаньне Зуева ў крымазаньні да рабкораўскага руху і ў тым, што ён былы афіцэр белай арміі зьяўляецца беспадстаўным і было накіравана на яго дыскрэдытацыю. З боку т. Валынца прасьледваньня т. Зуева ня было. Тав. Валынец на сходзе партактыву ў час абгаварэньня пытаньня самакрытыкі казаў, што ў непарадках у каапэратыве „Чырвоны Арэты" (дзе т. Зуеў зьяўляецца загалчыкам крамы) замешан і т. Зуеў, гэта дало назад да наступу некаторых асоб, для дыскрэдытаваньня.

Прэзыдыум ЦБК пастанавіў перадаць справу аб працаўнікох абвінавачаных Зуева на разгляд АКК. Гальскі

Інтэрнацыянальнае выхаваньне ў школе.

Кожнаму настаўніку, кожнаму піянэру і амаль што ня кожнаму вучню знае савецкае працоўнае школы відома, што наша школа павінна выхаваць у вучняў братэрскую прыхільнасьць да працоўных усяго сьвету—незалежна ад іх нацыянальнага паходжаньня—і варожасьць да ўсіх прыгнятальнікаў, да якой-бы нацыі яны ні належалі.

А што кажа школьная сапраўднасьць? Школьная сапраўднасьць часта кажа зусім адваротнае.

У нашых школах, а таксама ў тэхнікумах і ў вышэйшых навучальных установах мы маем шэраг выпадкаў нацыянальнае варожасьці, выпадкі антысэмітызму, яўрэйскага, беларускага, расейскага, польскага і іншых шавінізмаў.

Словы «жыд» і інш. досыць часта ўжываюцца ў паасобных школах, таксама, як ужываюцца ў паасобных школах і яўна антысэміцкія лёзунгі, накшталт „Бей жыдоў, спасай Расію». Адначасова сярод яўрэйскіх вучняў паасобных школ досыць часта ўжываюцца словы «мужык», «гой», назіраюцца пагардлівыя адносіны да беларускіх дзяцей і інш. Лаянкі, сваркі, а часам і бойкі паміж дзяцьмі паасобных нацыянальнасьцяй—вось чым мы кожны яшчэ «пахваліцца» ў галіне інтэрнацыянальнага выхаваньня. Насьмешкі, анэкдоты, прыказкі па адрасу свайго таварыша другой нацыянальнасьці—досыць частае зьявішча ў паасобных школах.

Нежаданьне разам працаваць, нежаданьне сядзець на адной лаўцы з таварышом па класе іншай нацыянальнасьці, насьмешкі адных з мовы другіх—гэта яшчэ да гэтага часу мае месца ў нашай сав. працоўнай школе

Наш партыйны, прафэсыйны, савецкі і камсамольскі нерыядычны друк падаў нямала фактаў нацыянальнай варожасьці, фактаў антысэмітызму, шавінізму ў нашых школах, у нашых навучальных установах. Гэтых фактаў аж надта даволі, каб забіць трывогу ў галіне інтэрнацыянальнага, у галіне клясавага выхаваньня ў нашых навучальных установах, у нашых працоўных школах, школах сацыяльнага выхаваньня.

Наш клясавы вораг нэпман, кулак і іх паслугачы з дробна-буржуазнага элемэнту, пабачыўшы посьпехі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, адчуўшы націск з боку пралетарскай дыктатуры, імкнецца рознымі шляхамі ўнесьці бязладзьдзе ў сям'ю працоўных.

Ён зрывае перавыбарчыя сходы саветаў, ён страляе ў селькораў і рабкораў, ён-жа распальвае антысэмітызм і шавінізм на нашых фабрыках і заводах, сярод працоўных гораду і вёскі, ён распальвае антысэмітызм і шавінізм і ў нашых навучальных установах, у нашых школах. І замест таго, каб перайсьці ў рашучы наступ на клясавага ворага, як у сьценах, так і за сьценамі школы, гэта значыцца—ў наўкольным асяродку, школа часам займае пасыўную пазіцыю ў гэтым змаганьні, у гэтым наступе на клясавага ворага рабочае клясы.

Камуністычная партыя як у сваёй праграме, так і ў шэрагу пастаноў дала ясныя дырэктывы і наказы ў галіне інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных мас у галіне інтэрнацыяльнага выхаваньня нашае моладзі. Спашлёмся на частку гэтых дырэктыў

Фармулюючы мэты асьветы ў савецкіх рэспубліках, камуністычная партыя ў сваёй праграме па гэтаму пытаньню дае нам наступную дырэктыву:

„Давесьці да канца пачатую ў Кастрычнікавай рэвалюцыі 1917 г. справу перабудовы школы са зброі клясавага панаваньня ў зброю поўнага зьнішчэньня падзелу грамады на клясы, у зброю камуністычнага пераладзьненьня грамады. У працягу часу дыктатуры пралетарыяту, значыцца ў працягу часу падрыхтоўкі ўмоў, якія зробяць магчымым поўнае ажыцьцяўленьне камунізму, школа павінна быць ня толькі праваднікам прынцыпаў камунізму наогул, але і праваднікам ідэйнага, арганізацыйнага, выхаваўчага ўплыву пралетарыяту на паўпралетарскія і непралетарскія колы працоўных мас дзеля выхаваньня пакаленьня, здольнага канчаткова ўстанавіць камунізм".

У нацыянальным

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР.

аб складзе Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах пры Народным Камісарыяце Земляроботва БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР пастанаўляе:

1. Аслабаніць т. Лабаноўскага, Якуба Язэпавіча, ад абавязкаў Старшыні Асобнай Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах пры Народным Камісарыяце Земляроботва БССР.

2. Назначыць тав. Зыбко, Ігната Вінцэсавага, Старшынёй Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах пры Народным Камісарыяце Земляроботва БССР.

3. Членамі Асобай Калегіі Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах пры Народным Камісарыяце Земляроботва БССР зацьвердзіць наступных асоб:

т. т. Пуцято, Гарпмана, Давіда Майсеявіча, Даўгаланцэву, Мар'ю Фамінічну, Тафеенка, Сямёна Ігнацьевіча;

Ад Наркамюсту: Несьцера, Сьцяпана Антонавіча і Штаера, Сьцяпана Сьцяпанавіча

Ад Наркамзему: Шычко, Антона Іванавіча, Вашчыла-Вірына, Міхаіла Гэрасімавіча і Філітава, Івана Пятровіча.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

2-га сакавіка 1929 г.
гор. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб ослабаненьні тав. Сасноўскага А. М. ад абавязкаў Намесьніка Старшыні Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі і аб назначэньні тав. Баля Б. М. Намесьнікам Старшыні Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Аслабаніць тав. Сасноўскага, Антона Міхайлавіча, ад абавязкаў Намесьніка Старшыні Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

2. Назначыць тав. Баля, Барыса Мікалаевіча, Намесьнікам Старшыні Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

За Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР У. Ігнатоўскі

9 сакавіка 1929 г.,
г. Менск.

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб адкліканьні члена Вярхоўнага Суду БССР тав. Баранава, Мікалая Андрэявіча, са складу Вярхоўнага Суду БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР пастанаўляе:

Адклікаць члена Вярхоўнага Суду БССР тав. Баранава, Мікалая Андрэявіча, са складу Вярхоўнага Суду БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

2-га сакавіка 1929 г.,
г. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра ўнясэньне зьмен у статуты кааперацыйных арганізацый у зьвязку з пастановай ЦВК і СНК СССР „Пра парадак утварэньня, хаваньня і выдаткаваньня запасных капіталаў кааперацыі".

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Запісаць § 25 нормальнага статуту рабочага кааператыву (З. З. БССР 1925 г. № 19, арт. 177) у наступнай рэдакцыі:

„§ 25. Сродкі рабочага кааператыву складаюцца з капіталаў: а) асноўнага (недзялімага), б) паявога, в) запаснага і г) спецыяльных".

2. § 29 нормальнага статуту рабочага кааператыву (З. З. БССР 1925 г, № 19, арт. 177); § 29 нармальнага статуту спажывецкага таварыства (З. З. БССР 1925 г. № 14, арт. 110); § 25 нармальнага статуту райённага (акруговага) саюзу Спажывецкіх Таварыстваў (З. З. БССР 1925 г. № 15, арт 111) і § 25 статуту Беларускага Саюзу Кааперацыйна-Спажывецкага Аб'яднаньня «Белкаапсаюз» (З. З. БССР 1925 г. аддзел II № 6, арт. 7); арт. 29 нармальнага статуту вытворчае арцелі інвалідаў-саматужнікаў (З. З. БССР 1926 г. № 1, арт. 1); арт. 28 нармальнага статуту акруговага (райённага) саюзу інвалідных кааперацыйных аб'яднаньняў (З. З. БССР 1926 г. № 2, арт. 7); арт. 25 статуту Беларускага Саюзу інвалідных кааперацыйных аб'яднаньняў (З. З. БССР 1926 г. № 24, арт. 91); арт. 25 статуту Беларускага Цэнтральнага Саюзу сельска-гаспадарчых крэдытных і саматужна-прамысловых кааператываў „Белсельсаюз" (З. З. БССР 1926 г. адд. II, № 1, арт. 1); § 25 статуту Беларускага Саюзу аб'яднаньняў саматужна-прамысловых кааператываў «Белкустпрамсаюз» (З. З. БССР 1926 г. адд. II, № 2, арт. 2) запісаць у наступнай рэдакцыі:

„ Запасны капітал утвараецца: а) з штогодніх адлічэньняў ня менш 10 проц. ад чыстага прыбытку за даны год і б) з процантаў на суму запаснага капіталу. Адлічэньні ў запасны капітал могуць быць спынены тады, калі запасны капітал будзе роўны 20 проц. усіх уласных капіталаў, акрамя паявога.

Парадак хаваньня і выдаткаваньня запаснага капіталу ўстанаўліваецца асобным законам».

3. § 26 статуту Беларускага Саюзу аб'яднаньняў саматужна-прамысловых кааператываў запісаць у наступнай рэдакцыі:

«26. Запасны капітал выдаткоўваецца выключна на пакрыцьцё страт ад аперацыі Саюзу».

4. Первічныя кааперацыйныя арганізацыі і іх акруговыя (райённыя) саюзы павінны зьмяніць на працягу месяца свае статуты ў адпаведнасьці з гэтай пастановай.

Нагляд за зьменаю статутаў ускладаецца на цэнтральныя саюзы кааперацыі.

5. Ад рэгістрацыі зьмен у сваіх статутах, якія зроблены паводле гэтага закону кааперацыйныя арганізацыі вызваляюцца.

6. Прапанаваць Эканамічнай Нарадзе і Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі ўнесьці адпаведныя зьмены ў зацьверджаныя імі індывідуальныя і тыпавыя статуты кааперацыйных арганізацый.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

6-га сакавіка 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Совета Народных Комиссаров БССР

о внесении изменений в уставы кооперативных организаций в связи с постановлением ЦИК и СНК СССР „О порядке создания, хранения и расходования запасных капиталов кооперации".

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Изложить § 25 нормального устава рабочего кооператива (С. З. БССР 1925 г., № 19, ст, 177) в следующей редакции.

«§ 25. Средства рабочего кооператива составляются из капиталов: а) основного (неделимого), б) паевого, в) запасного, г) специальных».

2. § 29 нормального устава рабочего кооператива (С. У. БССР 1925 г., № 19, ст. 177); § 29 нормального устава потребительского товарищества (С. У. БССР 1925 г., № 14, ст. 110); § 25 нормального устава районного (окружного) Союза Потребительских Обществ (С. З. БССР 1925 г., № 15, ст. 111) і § 25 устава Белорусского Союза Кооперативных Потребительских Об,единений («Белкоопсоюз») (С. У. БССР 1925 г., ст. 2-й, № 6, ст. 7); ст. 29 нормального устава производственной артели инвалидов кустарей (С. З. БССР, 1926 г., № 1, ст. 1), ст. 28 нормального устава окружного (районного) Союза Инвалидных Кооперативных Об'единений (С. З. БССР 1926 г., № 2, ст. 7), ст. 25 устава Белорусского Союза Инвалидных Кооперативных Об'единений (С. З. БССР 1926 г., 54, ст. 91), ст. 25 устава Белорусского Центрального Союза Сельско-Хозяйственных предприятий и кустарно-промысловых кооперативов «Белсельсоюз» (С. З. БССР 1926 г. II отд. № 1, ст. 1) и § 25 устава Белорусского Союза Об'единений Кустарно-Промысловых Кооперативов „Белкустпромсоюз" (С. З. БССР 1926 г. II отд. № 2, ст. 2) изложить в вледующей редакции: „Запасный капитал создается: а) из ежегодных отчислений не менее 10 проц. от чистой прибыли за данный год и б) из процентов на суммы запасного капитала. Отчисления в запасный капитал могут быць прекращены тогда, когда запасный капитал будет равен 20 проц. всех собственных капиталов, кроме паевого.

Порядок хранения и расходования запасного капитала устанавливается особым законом».

3. § 26 устава Белорусского Союза Об'единений Кустарно-Промысловых Кооперативов «Белкустпромсоюз» изложить в следующей редакции:

«§ 26 Запасный капитал расходуется исключительно на покрытие убытков от операции Союза».

4. Первичные кооперативные организации и их окружные (районные) союзы обязаны изменить в течение месяца свои уставы в соответствии с настоящим постановлением.

Наблюдение за изменением уставов возлагается на центральные союзы кооперации.

5. От регистрации изменений в своих уставах, сделанных согласно настоящего закона кооперативные организации освобождаются.

6. Предложить Экономическому Совещанию и Высшему Совету Народного Хозяйства внести соответствующие изменения в утвержденные ими индивидуальные и типовые уставы кооперативных организаций.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

6-го марта 1929 г., г. Минск.

БУДАЎНІЦТВА Ў МЕНСКУ.

НА ЖЫЛЬЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў МЕНСКУ СЁЛЕТА БУДЗЕ ВЫДАТКАВАНА 735 ТЫСЯЧ РУБ., 1.650 ТЫСЯЧ РУБ. НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ КАНАЛІЗАЦЫІ.

На жыльлёвае будаўніцтва сёлетняга сэзону ў Менску маркуецца выдаткаваць 735.000 руб. Гэтыя грошы будуць разьмеркаваны наступным чынам: 255.000 руб. на дабудаваньне дому ў 70 квартэр на рагу Камсамольскай і Унівэрсытэцкай, 40.000 р. на заканчэньне дому для начскладу на пляцы Парыскай Камуны, 80.000 р. на заканчэньне дому па Маскоўскай вул., 195.000 руб.—на будаўніцтва новага дому па Маскоўскай вул. на 76 кватэр, які будзе мець 202 пакоі. Пабудова гэтага дому будзе каштаваць 480.000 руб.

Апроч гэтага, камгас удзельнічае ў пабудове новага дому на 74 кватэры ў акцыянэрным т-ве «Домстрой» в паем у 75000 руб.

Па лініі дабрабыту сёлета мае быць выдаткавана 100.000 руб. Гэтыя сродкі пойдуць на забрукаваньне Лагойскага тракту. Нова-Камароўскай, Чырвонаармейскай і цэлага шэрагу інш. вуліц.

У галіне правядзеньня каналізацыі сёлета будзе выканана вялікая праца. Заключаны дагаворы з «Водоканалом» на 1.250.000 руб. на працяг работы па правядзеньню каналізацыі, пракладку калектару, напорнага вадаводу, на пабудову 20 гэкт. палявой фільтрацыі і інш.; апроч гэтага, заключаны дагавор на 400.000 руб. на правядзеньне дамовых злучэньняў каналізацыйных труб.

Сёлета можна будзе выкарыстаць для загарадных гуляньняў Антонаўскі парк, які займае каля 350 гэкт. У парку праведзены часткова дарожкі, зроблена агароджа. Камгас наладжвае з вясны аўтабусныя рэйсы ў парк. Перад ЦСПСБ і інш. арганізацыямі зараз стаіць задача папулярызацыі паркў сярод шырокіх працоўных мас, бо ён зьяўляецца вельмі карысным месцам адпачынку ў летні час.

Да будаўніцтва павільёнаў выстаўкі.

Зараз узмоцненым тэмпам адбываецца загатоўка будаўнічых матар'ялаў, каб з вясны распачаць будаўніцтва памяшканьняў усебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Усяго ў гэтым годзе будзе занята на будаўніцтве выстаўкі да 300 рабочых.

Замест чыгуначнай каляіны, якая меркавалася, да месца выстаўкі будзе праведзена трамвайная каляіна, па якой змогуць таксама рухацца і чыгуначныя вагоны.

ХРОНІКА.

ПРЫВІТАНЬНІ РАЙЁННЫХ ЗЬЕЗДАЎ САВЕТАЎ ЦВК БССР.

На імя Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР паступілі прывітальныя тэлеграмы ад райённых зьездаў саветаў: Клімавіцкага, Чэрыкаўскага, слуцкага, Заслаўскага, Жлобінскага, Рагачоўскага, Сіроцінскага і Бягомлскага райёнаў.

Вітаючы ЦВК БССР, райённыя зьезды саветаў запэўняюць вышэйшы орўан Савецкай Улады, што яшчэ з большай напружанасьцю пойдуць да далейшых перамог у справе сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

ДА 5-ГОДЗЬДЗЯ МОПР'у.

Скарбоначны збор на карысьць Мопр'у.

17 і 18 сакавіка Акруговы Камітэт Мопру наладжвае ў Менску скарбоначны збор, у правядзеньні якога прыймуць удзел звыш 400 чалавек актывістаў вячэек Мопру. Сабраныя сродкі пойдуць на ўзмацненьне фонду Мопру.

Урачыстыя вечары.

23 сакавіка ў Менск прыяжджае намесьнік старшыні Выканкому Мопру тав. Стасава. У гэты дзень у клюбе Карла Маркса будзе наладжан урачысты вечар, прысьвечаны 5-хгодзьдзю Мопру БССР.

25 сакавіка ў клюбе імя Леніна адбудзецца вечар палітэмігрантаў і былых паліткатаржан. На вечары будуць наладжаны ўспаміны.

Збор з білетаў у кіно і тэатры.

Паводле пастановы Прэзыдыума Менскага Гарсавету ў працягу 2 тыдняў пачынаючы з 18 сакавіка, на білеты ў кіно і тэатр будзе налічацца збор у карысьць Мопру. На білеты ў кіно—3 кап. і ў тэатры—5 кап.

У Менск прыехала прадстаўніца кампартыі Польшчы.

Учора ў Менск прыехала прадстаўніца камуністычнай партыі Польшчы тав. Марская.

Тав. Марская прыме ўдзел у вечарох, якія наладжваюцца Моврам.

КАМСАМОЛ РЫХТУЕЦЦА ДА ПРАМЫСЛОВАГА ПАХОДУ.

Камсамол гораду Гомелю пачаў падрыхтоўку да правядзеньня вытворчага паходу рабочай моладзі. Асноўнымі абвуагамі спаборніцтва—барацьба за надвышэньне вытворчасьці працы, зьніжэньне сабекаштоўнасьці, падвышэньне якасьці, вайна з прагуламі і г. д.

Будзе выдадзена адозва да ўсёй рабочай моладзі па пытаньню ўдзелу на спаборніцтве. Адбудуцца вытворчыя канферэнцыі рабочай моладзі. Апроч таго будзе праведзен акруговы конкурс на лепшую камсамольскую вячэйку па ўдзелу ў спаборніцтве.

17 новых хлебных крам.

У хуткім часе ў Менску будзе адчынена 17 новых хлебных крам. Па лініі МЦРК будуць адчынены 6 крам; на лініі працаколектыву пекароў—6 крам, транспартнай спажывецкай кааперацыі—3 крамы і кааперацыі інвалідаў—2 крамы.

Рэарганізацыя Бел. Дзярж. Капэлы.

Калегія Наркамасьветы даручыла Галоўмастацтву з наступнага году рэарганізаваць Беларускую Дзяржаўную Капэлу з мэтай падбору лепшага складу харыстаў. Рэарганізацыя будзе таксама праведзена і з мэтай паляпшэньня працы Капэлы. Побач з гэтым Наркамасьветы адпусьціў на выдаткі Беларускай Дзяржаўнай Капэле 1000 руб.

Ліквідацыя няпісьменнасьці.

У 13-ці райёнах Менскай акругі і гор. Менску сёлета навучаецца на лікпунктах 15.000 чалавек, з якіх 65 проц. жанчын. Сёлета назіраецца вялікі наплыў беднаты, батрацтва і дакрызыўнікаў. Калі летась навучаліся на лікпунктах да 200 дакрызыўнікаў, дык сёлета лік дакрызыўнікаў перавышае 1000 чалавек.

Назіраецца больш рэгулярнае наведваньне пунктаў.

Распачалі працу 6-месячн. курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў.

14 сакавіка распачалі сваю працу курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў для вясковых пачатковых школ.

На курсы прынята да 100 чалавек беспрацоўных, маючых сярэднюю адукацыю. Заняткі на курсах адбываюцца ў памяшканьні 2-й менскай семігадовай школы.

Улетку курсанты будуць праводзіць практычныя заняткі на сельскай гаспадарцы. У плян працы курсаў уведзена шэраг экскурсій на розныя прадпрыемствы г. Менску.

Нарада па вышэйшай адукацыі.

Калегія Наркамасьветы пастанавіла склікаць 15 красавіка нараду па вышэйшай адукацыі.

У нарадзе прымуць удзел рэктары ВНУ, прарэктары па навучальнай частцы, дэканы ўсіх факультэтаў, прадстаўнікі студэнцтва і інш.

На нарадзе будуць абгавораны пытаньні аб мэтавай установцы кожнай навучальнай установы і кожнага факультэту, плян разьвіцьця вышэйшай асьветы ў БССР і шэраг іншых пытаньняў.

Перападрыхтоўка настаўнікаў яўрэйскіх школ.

Навукова-мэтадалёгічны камітэт Наркамасьветы зацьвердзіў навучальны план летніх 6-тыднёвых курсаў па перападрыхтоўцы настаўнікаў яўрэйскіх пачатковых школ. У праграме курсаў шмат месца адведзена пытаньням сельскай гаспадаркі і падвышэньня ўраджайнасьці, вакцынацыі і грамадзкім дысцыплінам. Курсы адбудуцца ў г. Менску; імі будзе ахоплена звыш 60 настаўнікаў.

Курсы для батракоў.

Наркамасьветы пастанавіў з 1-га мая пры Віцебскім рабфаку арганізаваць 4-месячныя курсы для падрыхтоўкі батракоў у рабфакі БССР.

На курсы будуць прымацца батракі, якія маюць ня менш 2-гадовага стажу працы ў савгасах, а таксама тыя, хто працаваў у прыватных гаспадарках ня менш 5-ці гадоў.

Першыя і другія навіны мець прафстаж ня менш году.

На курсы будзе прынята 60 чалавек, прычым 35 проц. месц адводзіцца для батрачак. Скончыўшыя гэтыя курсы будуць прымацца на рабфакі бяз іспытаў (па разьм меркаваньні Наркамасьветы).

З ліквпунктаў таварыства „ПН" будзе выпушчана 24.500 чал.

Выпускі з усіх ліквпунктаў БССР адбудуцца ў парэд з 15 красавіка да 1-га мая.

У горадзе і вёсцы выпуск з ліквпунктаў будуць праводзіць спецыяльна вылучаныя камісіі з прадстаўнікоў мясцовых устаноў і арганізацый.

З ліквпунктаў таварыства «Проч няпісьменнасьць» сёлета будзе выпушчана 24.500 чал.

Каго яшчэ вычысьцілі з ВНУ.

За сахаваньне свайго сацыяльнага паходжаньня Наркамасьветы пастанавіў выключыць з БДУ студэнтаў Тэпліц Сару (Правгас), Нахэльсона (Мэхфак), Маршак (Правгас), Сталяра (Мэхфак) і Караклёва (з Горацкага рабфаку).

Апрача таго, выключаны з БДУ, як няправільна прынятыя: Фэльдман-Гіткіна і Кусьцікава.

Як праходзяць перавыбары Менскага гарсавету.

Да 10-га сакавіка ў Менску праведзена 128 перавыбарчых сходаў, на якіх прысутнічала 76 проц. абіральнікаў; жанчын прысутнічала 69 проц. За гэты час абрана 250 дэпутатаў і 121 кандыдат. Жанчын-дэпутатаў—26 проц., ці 67 чалавек.

Па партыйнасьці: членаў КП(б)Б—128, ці 63 проц., ЛКСМБ—28, ці 11 проц.

Па нацыянальнасьці: 146 беларусоў, 78 яўрэяў, 15 расейцаў, 8 палякаў і 5 інш. нацыянальнасьцей.

У Менск прыляціць самалёт—„Усе ў ТДА-Авіяхім".

Самалёт „Усе ў ТДА-Авіяхім" робіць агітпалёт па округах БССР. Цяпер самалёт знаходзіцца ў Бабруйшчыне. У аўторак, 19 сакавіка, самалёт прыляціць у Менск. Самалёту на аэрадроме будзе наладжана ўрачыстае спатканьне.

Самалёт ускалыхнуў грамадзкасьць.

Прылёт Самалёту «Все в Осоавиохим» у Гомельшчыну ў значнай меры ажывіў інтарэс працоўных да работы Асаавіяхіму. У Церахоўскім і Лоеўскім райёнах сялянства зрабіла ўрачыстую сустрэчу. На мітынгах прысутнічала да 1000 чалавек. Палёты паасобных сялян на самалёце былі падставай ажыўленых гутарак. Гэтыя сяляне агітавалі за ўступленьне ў Асоавіяхім.

Утвараньне запасу масла і сыру.

Дзеля большага забясьпечаньня цэрабконаў на асенні і зімовы сэзоны Белрабсэкцыя пастанавіла ў порыяд красавіка-верасьня ўтварыць запасы масла і сыру на 245 тон.

КІНО.

„АПОШНЯЕ КАХАНЬНЕ НАПАЛЕОНА".

(«Інтэрнацыянал».)

Гэты «гістарычны баявік», пэўна, мае ўжо стаўшы гады і сваю гісторыю. Але ёсьць нешта такое, што робіць яго прыемлемым і ў нашы часы. Трохі пра яго зьместа. Напалеон (асоба сапраўды гістарычная і ў гэтым гістарычнасьць фільму) у сваім завалёўным запале траціў у Польшчу. Польскія патрыёты пакладаюць на яго вялікія надзеі, яны чакаюць ад яго вызваленьня і адраджэньня Польшчы. Такі фон, на якім разгортваецца падводная любоўная інтрыга: каханьне Напалеона да маладое патрыёткі графіні Валоўскай і ўзаемнае каханьне графіні Валоўскай і ад'ютанта Напалеона—графа Эгіаса. Зразумела, нерамагае Напалеон, а нешчасьлівага каханка графіні чакае ганебная сьмерць.

Дзеве рысы трэба адзначыць: угодніцтва польскіх магнатаў перад Напалеонам і дасціпнасьм апошняга. Абедзьве рысы перададзены правільна і пераконваюча і гэта бязумоўна, станоўчы бок фільму. Больш ідэалёгі ў ім нельга шукаць. Фільму мае і іншыя пастановачныя вартасьці, таксама добра зложаны, дзея разгортваецца павольна, вразумела. Адзак нельга сказаць, каб фільм выклікаў асаблівую цікавасьць. Габ.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. «Замеры буржуазіі супроць СССР і мірная палітыка саветаў». Прамовы М. Калінына, К. Барашкава, М. Літвінава. Стар. 109, цана 10 кап.

2. «Сонечны паход» М. Чарот. Стар. 92, цана 75 кап.

3. «Ваўчаняты» А. Александровіч, А. Вольны, А. Дудар. Раман беларускіх мясоў. Выданьне другое. Старонак 159, цана 60 кап.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

НА КУРСЫ КАЛГАСНЫХ І КААПЭРАЦ. ПРАЦАЎНІКОЎ.

(На 1929-30 нав. год).

1. Курсы маюць на мэце падрыхтаваць працаўнікоў:

а) для вёзавой сеткі сельска-гаспадарчае кааперацыі, арганізатараў-кіраўнікоў вёзоўкі, галоўным чынам, крэдытнай кааперацыі (30 проц. усяго складу курсантаў і б) для непасрэднага кіраўніцтва саміні калгасамі (70 проц.).

2. Тэрмін навучаньня на курсах вызначан гадавы.

3. На 1929-30 навучальны год будзе прынята на курсы 350 чал.

4. На курсы прымаюцца:

а) члены УсеКП(б) (з 2-хгадовым партстажам) у правілах прыёму, агалошаных у часопісі „Известия ЦК ВКП", памылкова прапушчаны партстаж для камандируемых на курсы з рабочых (у тым ліку батракоў) і сялян, прычым рабочых павінна быць ня менш 50 проц., (служачыя на курсы ня прымаюцца).

б) Умеючыя добра чытаць, пісаць і ведаючыя чатыры дзеяньні арыфметыкі.

в) Маючыя палітычнае разьвіцьцё ў абсяге школы палітграматы.

г) Маючыя вопыт працы ў сельскай гаспадарцы (пажадана ў калгасах і савгасах); ня ведаючых сельскае гаспадаркі насылаць ня трэба.

д) Ва ўзросьце ад 20 да 33 гадоў.

5. У ліку кандыдатак на курсы жанчын павінна быць ня менш 15 проц.

6. Асаблівая ўвага пры вярбоўцы павінна быць зьвернута на неабходнасьць падбору кандыдатаў з вёзавых раданых работнікаў (калгасаў, вёзоўкі, сельска-гаспадарчае кааперацыі, савгасаў, ад варштату), прычым у ліку кандыдатаў на курсы непасрэдна з калгасаў павінна быць ня менш 40 проц., іх належыць браць з буйных калгасаў. Рэкамандуецца пасылка на курсы дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, у прыватнасьці чырвоных камандзіраў.

7. Адбор кандыдатаў на курсы адбываецца губэрскімі і акруговымі партыйнымі камітэтамі, з канчатковым зацьверджаньнем цэнтральнай прыёмачнай камісіяй пры аддзеле па працы ў вёсцы ЦК УсеКП(б).

8. Нацыянальныя вобласьці і напрэспублікі даюць сваіх кандыдатаў, якія ўладаюць расейскай мовай і адказваюць запатрабаваньням прыёму.

9. Усе кандыдаты, якія камандируюцца на курсы, павінны быць забясьпечаны месячным водпускам з захаваньнем утрыманьня на месцы працы, прычым канец водпуску павінен быць прыстасован ня позьдна да часу выезду ў Маскву.

10. Кандыдаты, якія камандируюцца на курсы, павінны быць цалкам забясьпечаны заработнай платай да часу выезду ў Маскву, а таксама ўсёй належачай выхадной дапамогай на месцы працы, аб чым кожнаму павінна быць выдадзена афіцыйная справка для падачы ў кіраўніцтва курсаў (да атрыманьня канчатковага адказу аб прыняцьці іх на курсы намечаных кандыдатаў з працы на месцах не звальняюцца).

11. Курсанты забясьпечваюцца на курсах інтэрнатам, пасьцельным рэчамі, харчамі і вучэбнымі дапамогамі (пасьцельнай бялізнай, абуткам, адзеньнем, наогул абмундыраваньнем курсанты не забясьпечваюцца). Апрача таго, курсанты атрымліваюць 15 руб. у месяц стыпэндыі на сябе; на утрыманьне сям'і, у залежнасьці ад месцавасьці (сяло ці горад) і ліку утрымліваемых, атрымліваюць ад 40 да 90 руб. (у сярэднім 75 руб.)

Увага: Інтэрнатам забясьпечваюцца толькі курсанты. З прычыны цяжкага шэрагу сур'ёзных перашкод і нявыгод, зьвязаных з прыездам членаў сям'і ў Маскву, шэраг сем'яў курсантаў у Маскву забараняецца.

12. Выдаткі на паездку кандыдатаў у Маскву на прыёмныя іспыты вырашаюцца на месцах аплачваюць партыйныя камітэты, якія камандируюць кандыдатаў. Парткомы і самі кандыдаты гэтым папярэджваюцца аб немагчымасьці аплачваць гэтыя выдаткі за рахунак ЦК.

13. Мясцовыя партыйныя камітэты не пасылаюць намечаных на курсы кандыдатаў у Маскву да атрыманьня паведамленьня ад Цэнтральнай Прыёмачнай Камісіі аб дапушчэньні таварыша да прыёмных іспытаў.

14. Камандируемыя на курсы кандыдаты на месцах павінны быць агледжаны доктарам і моць пасьведчаньне аб здавальняючым стане здароўя.

15. Камандируемыя на курсы таварышы асабліва дапрызыўнікі, на месцах, да адъезду ў Маскву, павінны аформіць свае адносіны да вайсковай службы (вынята з ку чоту, атрымаць, у выпадках патрэбы, неабходныя адтэрміноўкі, льготы і г. д.), бо курсы ў гэтых адносінах ніякіх абавязацельстваў і хадайніцтва аб аслабаненьні і г. д. на сябе не бяруць.

16. Адбор курсантаў мясцовыя партарганізацыі павінны распачаць ад дня атрыманьня гэтых правіл прыёму. Сьпісы намечаных кандыдатаў і ўсе неабходныя да іх матар'ялы і дакументы (гл. увагу) павінны быць прадстаўлены ў цэнтральную прыёмачную камісію не пазьней 1-га мая. Цэнтральная прыёмачная камісія паведаміць парторганізацыі аб дапушчаных да прыёмных выпрабаваньняў не пазьней 15-га чэрвеня.

Увага: Разам са сьпісам усіх кандыдатаў на кожнага з іх абавязкова павінна быць прадстаўлена: а) дакладна запоўненая анкета ў 2-х экземп.; б) камандыраванае пасьведчаньне (ад акругкому, губкому) в) характарыстыка, выдадзеная акругкомам (губкомам); г) дакумант аб адносінах да вайсковай службы; д) справка аб стане здароўя; е) справка аб здавальненьні пенсіяй; (гл. вышэй) ж) справка ад сельсавету ці дамкому, ці міліцыі аб сямейным становішчы з указаньнем колькасьці утрыманцаў, разьмерам заработку членаў сям'і кожнага ў асобку, дзе жывуць члены сям'і (у горадзе, вёсцы) і наяўна гаспадарцы (земля, дом, жывёла, інвэнтар, разьмер пасеву).

17. Прыёмныя іспыты на курсах праводзяцца ад 19 да 31 жніўня, з рэгулярныя заняткі пачынаюцца в 1-га верасьня.

18. Усе курсанты даюць абавязацельства на скончэньні курсаў працаваць не менш 3-х гадоў на вёзавой кааперацыйнай ці калгаснай працы.

19. Кожнага з намечаных кандыдатаў партком павінен азнаёміць з гэтымі правіламі.

ШАХМАТЫ № 9 (154).

Пад рэдакцыяй А. А. Каспэрскага.

Задача № 9 К. Эйдэльмана—Менск.



Бел. Кра3, Лd2, Лf4, Сс3, Ке7, п. g3 (6).

Чорн. Ерe3, Фh7, Сh8, Сb7, Ке5, п. п. g4, e4, c4, f7, d7 (10). Мат у 2 хады.

Чампіянат Менску.

На днях гульня ў чампіянаце заканчваецца. За першынства змагаюцца Розэнталь+7—2 і Мазэль І.+10—3; добра стаіць Шукевіч + 7½—1½. Вынік некаторых партый высьвятліць, хто з гэтых ігракоў заваюе першынства. Блюмберг, пачаўшы турнір дрэнна, цяпер энэргічна фінішуе—выігрывае партыю за партыяй, і можна спадзявацца, што займе ня нізкі чацьвертае месца (мае+8—4).

З маладых, акрамя Мазэля І., добрыя шансы на высокае месца мае Кацэльсон

Падрыхтоўка да міжпрафсаюзных спаборніцтваў.

11 сакавіка ў клюбе гарбароў пачаліся шахматна-шашачныя чампіянаты на саюз гарбароў. Прымае ўдзел каля 50 ігракоў, ёсьць і жанчыны, якія з посьпехам змагаюцца з мужчынамі. Так, шахматыстка з шчотачнае фабрыкі Лідман у першыя два дні выіграла ў мужчын.

У будаўніцтве.

Пад кіраўніцтвам майстра Гардона інтэнсіўна разгортваецца шашачная праца ў клюбе «Чырвоны будаўнік». Быў праведзен гуртавы турнір; першынства заваяваў Багамольнікаў. Гурток клюбу вгуляў таварыскі матч з гуртком „Торгстроя", матч выйграў клюб+10—2.

У хуткім часе будуць праведзены турніры па Менску, а потым па саюзу будаўнікоў усебеларускі турнір.

Апавяшчэньні.

— Сёньня а 8 гадз. увеч. у памяшк. 1-ай школы (Інтэрнацыянальная, 31) адбудзецца вечар для ўсіх сяброў групкомаў № 1, 2, 7 і шк. № 1 і 7, які прысьвечан 10 годзьдзю Камінтэрну і 18-му сакавіка. У вечары прымуць удзел удзельніці выканкому Камінтэрну.

— У нядзелю, 17 сакавіка, а 6 гадзіне ўвечары ў аўдыторыі № 33 (Земляробкі завулак) адбудзецца пасяджэньне юрыдычнай секцыі навуковага таварыства пры БДУ.

НА ПАВЕСТКІ:

Даклад праф. Краўчэнкі на тэму: «Новыя матар'ялы да дыпляматычнай гісторыі імпэрыялістычнай вайны».

— АПА Фрунзаўскага РК КП(б)Б паведамляе, што ў панядзелак, 18 сакавіка, роўна а першай гадзіне дня ў памяшканьні АПА Габінэту адбудзецца нарада ўсіх настаўнікаў Адзінай Партыйнай школы Фрунзаўскага РК.

З прычыны важнасьці пытаньняў просьба зьявіцца без спазьненьня.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, 16-III, а 6-й гадз. увечары адбудзецца сход утрымальнікаў, сяброў саюзу Працасьветы па выбарах дэпутатаў у Гарсавет.

— У нядзелю а 5 г. увеч. пасяджэньне фракцыі праўленьня дому; а 6 г. увеч. пасяджэньне праўленьня; а 8 г. увечары агульны сход сяброў юнсэкцыі дому (перавыбары бюро юнсэкцыі), пасьля—піво.

— Сёньня а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Асьветы адбудуцца заняткі хімкамандаў, складзеных з дэлегатаў Фрунзаўскага райёну, агульна-гарадзкога, нарсарч і Меншовіка.

Просьба зьявіцца своечасова.

Заняткі адбудуцца ў пакоі № 2.

— Даводзіцца да ведама слухачоў курсаў краязнаўства, што ў нядзелю, 17-III будуць працытаны лекцыі.

1. Выдуманьне гісторыі Беларусі за апошнія 10 год.—Заслуж. праф. акадэмік У. ПІЧЭТА.

2. Краязнаўства і падвышэньне ўраджайнасьці.—Сакрат. адд. прыроды і гаспадарні БАН САМЦЭВІЧ.

Пачатак роўна а 11 г. дня ў 41 аўд. пэдфаку (II-гі паверх).

Запрашаюцца студэнты Эканам. Адд. Фак. Права і Гаспадарні і іншых установаў.

Адказны рэдактар
М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

СУБОТА, 16-га САКАВІКА

Для членаў прафсаюзаў.

ПРЭМ'ЕРА „МОСТ"

(на шляхох індустрыялізацыі)

П'еса ў 4 дзеях, 9 абразох А. РАМАНОВІЧА.

Білеты—у рабочай касе. Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». З аўторка 12 сакавіка. ЗАМЕЖНЫ МАСТАЦКІ БАЯВІК „РЭЙНСКІ БУНТАР" У 8 частках. Пачатак а 7 гадзіне.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ „ДРУГОЕ ЖЫЦЬЦЁ" У 8 ЧАСТКАХ ПАЧАТАК А 7 ГАДЗІНЕ.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка 12 сакавіка. Мастацкі г